Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛІСТАПАДА 2008 г. ЧАЦВЕРГ
№ 219 (26332)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«Прамая лінія»

## ПРАГОНІМ ПРЭЧ ПРАСТУДУ, ПАЗБАВІМСЯ АД АЛЕРГІІ

У вашага дзіцяці алергія? Яно шмат і працягла хварэе? Часта прастуджваецца? Як дапамагчы малому справіцца з гэтымі немачамі і што можна параіць бацькам у якасці прафілактычных мераў супраць такіх хваробаў, можна пагаварыць на нашай чарговай «прамой лініі» з **дацэнтам кафедры дзіцячых інфекцыйных хваробаў БДМУ, кандыдатам медыцынскіх навук Лідзіяй Іванаўнай МАТУШ.**

«Прамая лінія» адбудзецца **СЁННЯ, 20 лістапада, з 14.00 да 15.00** па тэлефонах: 8(017) 292 38 92 і 292 38 21.

# БЕЛАРУСКІ ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ ФОРУМ ПЕРАСЯГНУЎ УСЕ НАШЫ СПАДЗЯВАННІ

**Аб гэтым заявіў у Лондане прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, падводзячы вынікі інвестфоруму.**

Паводле яго слоў, першапачаткова прадугледжвалася, што колькасць удзельнікаў форуму складзе 200-220 чалавек. У выніку яна перасягнула 370. Удзел у мерапрыемстве быў платным, і такая колькасць удзельнікаў сведчыць аб тым, што еўрапейскія бізнэсмены хацелі паглядзець на Беларусь, даведацца, як у нашай краіне ідуць рэформы. «Мы зрабілі ўсё, каб яны не толькі пачулі, але і адчулі дух перамен, якія адбываюцца ў Беларусі», — сказаў Сяргей Сідорскі.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу Беларусь прадставіла рэальныя праекты, паказала адкрытасць эканомікі, якую гэты крызіс закрануў у найменшай ступені. «Усе ўдзельнікі выказалі думку, што гатовы інвеставаць у нашу краіну. Ёсць вялікая зацікаўленасць інвестараў працаваць у Беларусі, у тым ліку інвестараў з арабскага свету», — канстатаваў беларускі прэм'ер.

Гаворачы аб канкрэтных напрамках развіцця супрацоўніцтва паміж беларускімі і еўрапейскімі прадпрыемствамі, Сяргей Сідорскі адзначыў, што ў ходзе яго сустрэч у рамках форуму з кіраўнікамі буйнейшых еўрапейскіх прадпрыемстваў былі абмеркаваны асобныя праекты, зацікаўленасць у якіх выказалі замежныя бізнэсмены. У прыватнасці, кампанія «Катэрпілар» (ЗША) прапануе перанесці шэраг сваіх вытворчасцяў у Беларусь. Былі абмеркаваны і іншыя праекты, звязаныя з дзейнасцю МАЗ, МТЗ.

Беларусь імкнецца заняць дастойнае месца ў агульным еўрапейскім доме і стаць мостам для развіцця адносінаў паміж Расіяй і Захадам. Гэта канстатавалася на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага з дзяржаўным міністрам па справах Еўропы, членам Кабінета міністраў Вялікабрытаніі Кэралайн Флінт.

Сяргей Сідорскі падкрэсліў, што Беларусь і Вялікабрытанія заўсёды былі саюзнікамі ў самы складаны час.

Прэм'ер-міністр таксама расказаў аб сустрэчах напярэдадні ў Лондане з прадстаўнікамі палітычных колаў Вялікабрытаніі. У брытанскім парламенце з членамі Палаты абшчын і Палаты лордаў былі абмеркаваны ў тым ліку пытанні, што датычацца тых санкцый, якія мела Беларусь. Паводле слоў Сяргея Сідорскага, у ходзе сустрэч усе выказаліся за тое, што эканамічныя рэформы ў Беларусі ўсяляюць упэўненасць у выбраным палітычным курсе і пацвярджаюць стабільнасць эканамічнага развіцця ўстойлівай работай эканомікі. Прадстаўнікамі палітычных колаў было адзначана, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу стабільнасць Беларусі выклікае ва ўсіх проста павагу.

«Беларусь як эканамічна развітая дзяржава можа быць добрым іграком на еўрапейскім рынку. Гэта адзначалі і многія ўдзельнікі Беларускага інвестыцыйнага форуму», — сказаў Сяргей Сідорскі.

«Нам трэба больш адкрывацца, больш заяўляць аб сабе», — падкрэсліў прэм'ер-міністр, дадаўшы, што ў многім гэтаму будзе садзейнічаць правядзенне такіх форумаў, як у Лондане.

**БЕЛТА.**

# Беларусбанк з 19 лістапада змяніў працэнтныя стаўкі па крэдытах для фізічных асобаў

**ААТ «ААБ Беларусбанк» з 19 лістапада змяніла працэнтныя стаўкі па новазаключаемых з фізічнымі асобамі крэдытных дагаворах у беларускіх рублях і замежнай валюце. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў банку.**

Тут таксама растлумачылі, што падрабязную інфармацыю адносна атрымання крэдытаў і аказання банкам іншых паслуг можна атрымаць у любой установе ААТ «ААБ Беларусбанк». На сайце Беларусбанка таксама размешчаны віды і ўмовы выдачы крэдытаў насельніцтву па новазаключаемых дагаворах. Так, гадавая стаўка на крэдыты ў беларускіх рублях для будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў і кватэр, на іх рэканструкцыю, набыццё індывідуальных жылых дамоў і кватэр для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, складзе 15 працэнтаў. Для грамадзян, якія не маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, працэнтная стаўка складзе 20 працэнтаў.

Кошт крэдытаў на спажывецкія патрэбы ў беларускіх рублях на 1 год складзе 16 працэнтаў. А для грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у сельскай мясцовасці, — 15 працэнтаў.

У Беларусбанку таксама нагадалі аб змяненні з 17 лістапада працэнтных ставак па тэрміновых банкаўскіх укладах у замежнай валюце. Тут на розныя віды ўкладаў стаўкі павышаны ад 10 да 12 працэнтаў гадавых.

# ПЕРШАСНЕЖНЫ ЛАСУНАК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Мінчанка Анжаліка ТОПАЛЬ корміць галубоў у час першага снегапада.

# Скверы імя С.В. Прытыцкага і «Садружнасць» з'явіліся ў Мінску

**Дэпутаты Мінгарсавета ў ходзе 13-й сесіі прысвоілі назвы вуліцам і безыменным скверам сталіцы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Праектуемая вуліца № 4 на ўчастку ад вуліцы Калеснікава да вуліцы Каменнагорскай названа Налібоцкай у гонар Налібоцкай пушчы, якая знаходзіцца на захад ад Мінска ў басейне ракі Нёман. Сімвалічна, што і ў Мінску вуліцы Нёманская і Налібоцкая будуць знаходзіцца побач.

Праектуемая вуліца № 5 на ўчастку ад вуліцы Калеснікава да вуліцы Каменнагорскай атрымала назву Люцынская. У XIX стагоддзі маёнтак Люцынка знаходзіўся на захад ад Мінска каля Налібоцкай пушчы і належаў беларускаму пісьменніку В. Дуніну-Марцінкевічу, якому ў 2008 годзе спаўняецца 200 гадоў.

Праектуемая вуліца № 6 на ўчастку ад вуліцы Калеснікава да вуліцы Каменнагорскай названа Лідскай. Горад Ліда знаходзіцца на захад ад Мінска па гродзенскай трасе, таму існаванне вуліцы Лідскай абсалютна лагічнае, лічаць дэпутаты Мінгарсавета. У 2008 годзе Ліда святкуе 685-годдзе.

Народныя выбраннікі таксама прысвоілі безыменнаму скверу ў межах вуліц Даўгабродская — Кашавога і Палаца культуры МТЗ назву «Сквер «Садружнасць». Такая прапанова паступіла ад адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска. На тэрыторыі гэтага сквера ўстаноўлены памятны знак-стэла ў гонар загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны воінаў-казахстанцаў.

Безыменны сквер па вуліцы Прытыцкага побач з дамамі № 6, 8, 10 і 12 атрымаў назву «Сквер імя С.В. Прытыцкага». З такой прапановай выйшла грамадскае аб'яднанне ветэранаў Фрунзенскага раёна, Мінскі гаркам КПБ у сувязі з 95-годдзем з дня нараджэння выдомага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча Сяргея Прытыцкага.

# РЭАЛЬНЫ АЖЫЯТАЖ НА «РЭАЛЬНЫ» ФУТБОЛ

Учора ў 10 гадзін раніцы ў касах сталічнага стадыёна «Дынама» і барысаўскага гарадскога стадыёна пачаўся продаж білетаў на матч пятага тура групавога турніру Лігі чэмпіёнаў паміж барысаўскім БАТЭ і мадрыдскім «Рэалам», які адбудзецца ў Мінску 25 лістапада. Чаргу займалі ў чатыры гадзіны раніцы. Вецер і мокры снег фанатаў не палохалі. Большасць жа аматараў з'явілася ля касаў у шэсць гадзін раніцы, чарга імгненна вырасла дзесьці ў 300 метраў. У 13 гадзін, паводле прызнання амапаўцаў, якія падтрымлівалі парадак на вуліцы Кірава падчас продажу білетаў, колькасць ахвотных іх набыць складала не менш за 3,5 тысячы. Усяго ў касы стадыёна «Дынама» паступіла 14 тысяч квіткоў. У адны рукі прадавалася не больш за чатыры білеты. Можна было набыць квіткі ў 8-10, 17-19, 20-25 сектары за 20, 50 і 70 тысяч рублёў.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

# Жылыя дамы ў сельскай мясцовасці будуць прымаць толькі пасля выканання работ па ўнутранай аддзелцы

Жылыя дамы (кватэры), будаўніцтва якіх ажыццяўляецца сельскагаспадарчымі арганізацыямі, будуць прымацца ў эксплуатацыю толькі пасля выканання работ па ўнутранай аддзелцы памяшканняў і добраўпарадкаванні прылеглай тэрыторыі. Адпаведнае змяненне ва ўказ ад 30 жніўня 2005 года № 405 «Аб некаторых мерах па будаўніцтве жылых дамоў (кватэр) у сельскагаспадарчых арганізацыях» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўнёс 18 лістапада ўказам № 623. Да гэтага часу работы па ўнутранай аддзелцы і добраўпарадкаванні тэрыторыі павінны былі выконвацца ў двухмесячны тэрмін пасля прыёмкі такіх дамоў (кватэр) у эксплуатацыю за кошт сродкаў сельскагаспадарчых арганізацый або работнікаў, якім яны прадастаўлены. Аднак Камітэт дзяржаўнага кантролю пры праверцы выканання актаў заканадаўства ў будаўнічай галіне Брэсцкай вобласці ўстанавіў шматлікія факты нізкай якасці будаўніцтва жылых дамоў у сельскай мясцовасці і выявіў парушэнні, дапушчаныя будаўнічымі, праектнымі і іншымі арганізацыямі будаўнічага комплексу вобласці, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Гэтыя акалічнасці сталі падставай для ажыццяўлення дзейсных мераў па павышэнні якасці прымаемых у эксплуатацыю названых жылых дамоў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «Ты пакліч мяне. Пазаві...»



**Сёння магла б святкаваць свой юбілей Яўгенія Янішчыц — усяго толькі 60-гадовы! Не вельмі вялікі тэрмін для звычайнага чалавека, але, як сведчыць жыццё, і ён для многіх Сапраўдных Паэтаў становіцца занадта доўгім — імкліваю птушкаю Жэня адляцела ад нас дваццаць гадоў таму, пакінуўшы пранізлівыя светлыя вершы.**

* * *

*Ты пакліч мяне. Пазаві.*
*Там заблудзімся*
*ў хмельных травах.*
*Пачынаецца ўсё з любві,*
*Нават самая простая ява.*
*І тады душой не крыві*
*На дарозе жыцця шырокай.*
*Пачынаецца ўсё з любві —*
*Першы поспех і першыя крокі.*
*Прыручаюцца салаўі*
*Там, дзе выбеглі ўдаль канавы.*
*Пачынаецца ўсё з любві —*
*Адчужэнне, і боль, і нянавісць.*
*Ты пакліч мяне. Пазаві.*
*Сто дарог за маімі плячыма.*
*Пачынаецца ўсё з любві.*
*А інакш і жыць немагчыма.*

* * *

*У шуме жытняга святла*
*Яшчэ расці маёй трывозе*
*І не любіць — на паўкрыла.*
*Убачу маму на дарозе*
*У шуме жытняга святла.*

*І покуль гэты поўдзень спелы*
*Дым тарфяны не завалок,*
*На зрэзе дня — рамонак белы*
*І пасівелы васілёк.*

*Снуецца беглая сцяжына —*
*Апошні збег майго сяла.*
*Гняздзечка птушкі і ажына —*
*У шуме жытняга святла.*

*І покуль дыхае планета,*
*Не вынішчаецца датла*
*Душа народа і паэта*
*У шуме жытняга святла.*

* * *

*Будзе слоту абвяшчаць прагноз,*
*Лістабой учыніць ператруску.*
*Песняй, што расчуліла да слёз,*
*Я прыму цябе па-беларуску.*

*Краю блаславёнага дачка,*
*Дзякуй лёсу,*
*маю не ў нагрузку —*
*Зорны крыж Мацея Бурачка...*
*Ты ўва мне прызнаеш беларуску?*

*Сто разоў шукай другой красы,*
*А тым больш*
*што свет даўно не вузкі!*
*...Ды калі ты не бязродны сын —*
*Гавары са мной па-беларуску.*

*Час — вар'ят, шалёнае таксі.*
*Толькі ўсё ж*
*не мыслю я аб спуску.*
*Кажаш, што магілы зараслі?*
*Памаўчы са мной па-беларуску.*

*Якая я*
*Не адыходзь! Цябе так многа*
*Між зор, між сноў, між лугаўя.*
*Над горкай памяццю былога*
*Якая я, якая?*

*Застынь,*
*каб мне хоць раз вярнуцца*
*Да вуснаў, нібы ручая.*
*Між дзікіх ягад і настурцый —*
*Якая я, якая я?*

*Хоць прашумі вясёлым ліўнем! —*
*Хай след падкажа каляя.*
*Паміж няшчасных і шчаслівых —*
*Якая я, якая я?*

*Ні ў поля вольнага, ні ў гаю,*
*Ні ў зор, ні ў сноў, ні ў лугаўя,*
*Я ў аднаго цябе спытаю,*
*Якая я.*

**Сумная вестка — на 78-ым годзе жыцця ўчора памёр Алег Антонавіч ЛОЙКА — паэт, духоўны настаўнік многіх беларускіх пісьменнікаў. Працяглы час ён узначальваў філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, кіраваў універсітэцкім аб'яднаннем «Узлёт». Член-карэспандэнт Акадэміі навук, прафесар. Смуткуем, спачуваем.**

**Звяздоўцы.**

Крымінал

## ЗЛОЎЖЫВАННЕ ЦАНОЙ У 217 МЛН?..

**Пракуратурай Гарадоцкага раёна ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы ААТ «Гарадоцкі льнозавод».**

Падазраецца гэты мясцовы жыхар пры пасадзе ў злоўжыванні службовым становішчам. У выніку яго дзеянняў са снежня 2006 па сакавік гэтага года таварыству быў нанесены ўрон у памеры 217 мільёнаў рублёў.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

## $10 ТЫСЯЧ — ЗА ПАДПІСАНУЮ ДАМОВУ?..

**Генеральнай пракуратурай па матэрыялах падраздзяленняў па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС і УУС Мінаблвыканкама ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы ААТ «Жлобінскі рамонтна-механічны завод».**

Паводле папярэдняй інфармацыі, падазраецца 63-гадовы жыхар Жлобінскага раёна ў тым, што 18 кастрычніка ў Жлобіне атрымаў ад прадстаўніка адной з маскоўскіх фірмаў хабар у памеры 10 тысяч долараў ЗША. Як мяркуецца, за гэтыя грошы адказная асоба бралася станоўча вырашыць пытанне аб заключэнні дамовы на пастаўку арматурнай загатоўкі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Слуцком райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства *административно-производственного здания*, об.пл. 5017,0 кв.м, расположенного по адресу: г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 15. Начальная цена – 1 436 400 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.04.2008 г. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Рэпартаж з колаў

# «Мы жывём у Беларусі — значыць павінны ведаць беларускую мову...»



Звяздоўскі прыз падпісчыцы з задавальненнем уручыў намеснік старшыні Жлобінкага райвыканкама Віктар Аляксеевіч КОСЦІКАЎ.

**Дзень нашага жыцця... Даўно заўважана: можна прысвяціць яго звыклым заўсёдным і, зразумела ж, патрэбным клопатам — працы, сям'і. І тады ён стане, як іншыя, звычайныя — нічым, мо, не адметным, нічым не памятным, шэрым. А можна (у нашым выпадку) пагрузіць у багажнік аўто сціплы рэквізіт, прызы для падпісчыкаў і...**

Мы любім бываць на Гомельшчыне. Напэўна таму, што проста незабыўныя ўражанні засталіся ад папярэдніх сустрэч з чытачамі ў самім абласным цэнтры, у Нароўлі, Жыткавічах, Лельчыцах, само сабой — у Рагачове, а ўжо на Чачэршчыне...

Не аднойчы мы былі і ў Жлобіне: у першы раз (тады сустрэча праходзіла ў раённым вузле паштовай сувязі, калі ім кіраваў яшчэ — светлай памяці! — Аляксандр Віктаравіч Піліпенка) везлі з сабой тэлезізар, у другі раз — халадзільнік (што прыемна — даўняму падпісчыку і ветэрану Вялікай Айчыннай...). Не з пустымі рукамі ехалі і цяпер. Прычым везлі не столькі прыз, колькі... узнагароду. Бо, як прызнала начальнік аддзялення паштовай сувязі пасёлка Лукскі, Н.М. Круцялёва, больш актыўнага і адданага падпісчыка, чым Зінаіда Канстанцінаўна Маліноўская, «пашукаць яшчэ трэба».

Як высветлілася, падставы для гэтых слоў ў Наталлі Міхайлаўны былі — у кватэру Маліноўскіх пастаянна прыходзіць не менш за шэсць выданняў.

— «Звязду» мне параіў выпісаць мой калега, настаўнік рускай мовы і літаратуры Анатоль Сяргеевіч Шыхавец, — расказала потым Зінаіда Канстанцінаўна. — Паслухала, паспрабавала, — спадабалася. Прычым не толькі мне: муж заўсёды чытае, сыны... Падабаецца, што ўсё ў ёй на роднай мове, коратка, што не абыходзіце ўвагай праблемы адукацыі, што многа пішаце пра здароўе, пра наша «Радзіннае». Гэта мае любімыя рубрыкі, бо я заўсёды стараюся трымацца здаровага ладу жыцця, жыць у гармоніі...

Як здалося, Зінаідзе Канстанцінаўне гэта ўдаецца, бо поплеч параней шаму любімы муж (ён, па словах жонкі, цудоўны токар, працуе ў будаўнічым трэсце № 40), любімыя сыны (абодва атрымалі вышэйшую адукацыю, працуюць па спецыяльнасцях), любімая прафесія, лапік зямлі, безліч кветак на падваконнях. Ну і, зразумела ж, любімыя ўнукі!

— Яны часта ў нас з дзедам бываюць, — дзялілася Зінаіда Канстанцінаўна, — асабліва летам. Большы (ён у другі клас цяпер ходзіць) пытае неяк: «Бабушка, а почему ты дома всё время разговариваешь по-белорусски?» Я яму і адказваю, што мы жывём у Беларусі — значыць павінны ведаць беларускую мову. А яе ж не вывучыш, калі не размаўляць, калі не чытаць нічога.

Школка, дзе Зінаіда Канстанцінаўна выкладае англійскую, на жаль з рускай мовай навучання. Жыхары пасёлка таксама ў большасці гавораць па-руску. Не кажучы ўжо пра сам райцэнтр: не ўбачылі ў ім (мо, дрэнна глядзелі?) ніводнай беларускай шыльдачкі, не пачулі на вуліцах ніводнага нашага слоўка.

*(Заканчэнне на 5-й стар.)*

БЕЛАРУСБАНК
Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»
№1 ВЫБОР ГОДА 2007
БАНК № 1
«ПРЕСТИЖ»
новый срочный вклад в белорусских рублях и иностранной валюте (доллары США, ЕВРО, российские рубли)
Срок действия вклада — 3 месяца.
Размер дохода по вкладу:
- в белорусских рублях — 15 % годовых;
- в иностранной валюте — 10 % годовых.
ФИКСИРОВАННАЯ СТАВКА.
ЕЖЕМЕСЯЧНАЯ КАПИТАЛИЗАЦИЯ ДОХОДА
и возможность его выплаты.
Вклад может быть открыт на имя другого лица.
Подробные условия вклада – на сайте
www.belarusbank.by
и по "зеленому номеру" 8 801 100 5454 (звонок бесплатный)
Наш "ПРЕСТИЖ" — Ваш ДОХОД!
Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей
УНП 100325912. Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ N 1 от 28.08.2008 г.
Сохранность и возврат вкладов в ОАО "АСБ Беларусбанк" гарантируются в порядке, установленном законодательством РБ.

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 143,00 |
| 1 еўра | 2 701,04 |
| 1 латвійскі лат | 3 807,75 |
| 1 літоўскі літ | 782,15 |
| 1 чэшская крона | 105,12 |
| 1 польскі злоты | 700,73 |
| 1 расійскі рубель | 78,09 |
| 1 украінская грыўня | 349,88 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*
**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 27,4413 |
| 10 UAH | 34,6693 |
| 1000 BYR | 12,9838 |
| EUR | 45,8501 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.11.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*
*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Прычына прастуды — адэнавірусная інфекцыя

**За апошні тыдзень (з 10 па 16 лістапада) у кантрольных гарадах Беларусі было зарэгістравана 42 195 выпадкаў захворвання на грып і вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі — гэта на 25 працэнтаў больш, чым на папярэднім тыдні, але на 6,5 працэнта менш у параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года.**

Па інфармацыі Нацыянальнага цэнтра па грыпе, пакуль што ў «вірусным пейзажы» пераважае адэнавірусная інфекцыя (74,3 працэнта ўсіх даследаваных лабараторна ўзораў). Ёсць таксама і лабараторна пацверджаныя выпадкі захворвання беларусаў на грып (8 працэнтаў ад агульнай колькасці). Ва ўсіх астатніх выпадках прычынай прастуды стала змешаная інфекцыя ці парагрып.

На сёння ўзроўні захваральнасці на грып застаюцца нізкімі пераважна ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Успышачная актыўнасць грыпу была зарэгістравана толькі ў Англіі, Ірландыі і Польшчы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Краіна здароўя

Выпуск № 51 (107)

## ВЫПУСК МЕДЫЦЫНСКІХ ВНУ ЎДВАЯ МЕНШЫ ЗА КАДРАВЫЯ ПАТРЭБЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

**Па забяспечанасці насельніцтва ўрачамі Беларусь займае пятае месца ў свеце — у нашай краіне гэты паказчык складае 27,9 на 100 тысяч чалавек. Усяго на пачатак гэтага года ў Беларусі налічвалася 42 тысячы ўрачоў. Гэтыя лічбы прыводзіліся на сумесная нарадзе Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і Сусветнай федэрацыі медыцынскай адукацыі.**

— Аднак непасрэдна ўрачоў-лячэбнікаў у нас толькі 27 тысяч чалавек, — паведаміў **начальнік упраўлення кадравай палітыкі, ўстаноў адукацыі і знешніх сувязяў Міністэрства аховы здароўя Сяргей СЫЧЫК**. — Амаль 10 тысяч з агульнай колькасці ўрачоў — гэта стажоры і ўрачы-дыягносты і больш як 1800 — кіраўнікі лячэбна-прафілактычных устаноў. Паказчык укамплектаванасці сярэднім медыцынскім персаналам у цэлым па краіне вельмі нядрэнны — усяго ў галіне працуюць 118 тысяч спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй, з іх непасрэдна медыцынскіх сёстраў — каля 80 тысяч чалавек, 11 тысяч фельчараў і каля 13 тысяч лабарантаў. Аднак, напрыклад, у сталіцы дэфіцыт медыцынскіх сёстраў — каля 1 тысячы. Актуальны дэфіцыт медыцынскіх сёстраў таксама і для некаторых абласных цэнтраў. Дэфіцыт жа урачоў адчуваецца ў амбулаторна-паліклінічным звяне, у сельскіх рэгіёнах, у раёнах, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, а таксама ў райцэнтрах, дзе вострa не хапае «вузкіх» спецыялістаў. Так на пачатак года не мелі ніводнага ўрача 36 урачэбных амбулаторый і 10 бальніц сястрынскага догляду. Урачэбную дапамогу насельніцтву там аказвалі выязныя брыгады спецыялістаў.

Па словах Сяргея Сычыка, усяго ў галіне маюцца 55 тысяч пасадаў урачоў, каля 3 тысяч з іх застаюцца вакантнымі. Каэфіцыент сумяшчальніцтва склаў летась ва ўрачоў 1,39. Такім чынам розніца паміж фізічнымі асобамі і штатнымі адзінкамі складае 16 360 спецыялістаў. Да таго ў галіне ж працуюць 6200 урачоў і 12 тысяч медыцынскіх сёстраў пенсійнага ўзросту, якія ў любы момант могуць пайсці на заслужаны адпачынак.

Штогадовая патрэба ва ўрачэбных і правізарскіх кадрах пастаянна расце і на сёння складае 4328 спецыялістаў (у 2004 годзе — 3145 спецыялістаў). Адна з прычын такога росту — допушчаныя памылкі ў планаванні. Па-першае, раней патрэба вызначалася без уліку «вузкіх» спецыялістаў (зараз штогадовая патрэба ў іх складае 1590 урачоў), а пры размеркаванні выпускнікоў ухіл рабіўся на камплектацыю першаснага звяна і ўстаноў аховы здароўя ў сельскай мясцовасці. Таксама па-за кадрам засталіся і штатныя пасады, занятыя па сумяшчальніцтве (між іншым, такіх да 40 працэнтаў ад агульнай колькасці). Ёсць і аб'ектыўныя прычыны, якія нельга было прадбачыць. Так, у сувязі са змяненнямі, унесенымі ў Працоўны кодэкс, працягласць змены не можа быць большай за 12 гадзін, а раней урачы маглі выходзіць на сутачныя дзяжурствы. Значыць, патрэба ў персанале ўзрасла.

Ліквідаваць «прарэхі» ў кадравай палітыцы толькі за кошт выпускнікоў медыцынскіх ВНУ пакуль не ўдаецца. Так, у 2008 годзе заяўкі арганізацый аховы здароўя былі выкананы ўсяго на 44,7 працэнта (у 2006 годзе — на 54 працэнты, у 2005 годзе — на 46 працэнтаў). А патрэбу ў «вузкіх» спецыялістах медыцынскія ўніверсітэты змаглі «закрыць» толькі на 23,9 працэнта. Патрэбы сельскай медыцыны былі задаволены на 67,3 працэнта, а раёнаў, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, — на 51 працэнт.

У немалой ступені кадравы дэфіцыт, які ўтварыўся ў медыцынскай галіне, звязаны са змяншэннем напрыканцы 90-х гадоў набору студэнтаў у медыцынскія ВНУ. Апошнія некалькі гадоў прыём у медыцынскія ўніверсітэты пастаянна павялічваўся: так, калі ў 2004 годзе вышэйшую медыцынскую адукацыю атрымлівалі 9 тысяч 135 чалавек, то сёння іх ужо 14 тысяч. Павелічэнне набору ажыццяўлялася як на «бюджэт», так і на платную форму навучання. Але ўлічваючы матэрыяльна-тэхнічную базу ВНУ і іх прафесарска-выкладчыцкі склад, мы фактычна дасягнулі той мяжы, пасля якой павелічэнне набору становіцца немагчымым, інакш пацерпіць якасць падрыхтоўкі будучых урачоў.

Сяргей Сычык упэўнены, што кадравыя праблемы трэба вырашаць комплексна: «Я маю на ўвазе меры, якія мясцовыя ўлады павінны прымаць для замацавання маладых спецыялістаў на месцах: забеспячэнне іх жыллём, матэрыяльнае стымуляванне, стварэнне ўмоў для прафесійнага росту». Заўважана, напрыклад, што да 30 працэнтаў выпускнікоў пасля адпрацоўкі па размеркаванні змяняюць сваё месца працы.

У міністэрстве спрабуюць скласці «сцэнарый» на бліжэйшыя 5-6 гадоў. Тэарэтычна з улікам цяперашніх аб'ёмаў падрыхтоўкі спецыялістаў і многіх іншых акалічнасцяў патрэбы беларускай медыцыны ў вышэйшых медыцынскіх кадрах могуць быць задаволены да 2014 года. Аднак у кадравым упраўленні галоўнага медыцынскага ведамства ўсё ж такі робяць агаворку: улічыць абсалютна ўсе нюансы, якія могуць узнікнуць за гэты час, на жаль, немагчыма.

— Мы прааналізавалі, пачынаючы з 2004 года прычыны страты ўрачэбных кадраў. Высветлілася, што кожны год гэта лічба складае ад 1500 да 1786 чалавек. Толькі па прычынах выхаду на пенсію, інвалідызацыі ці смерці галіна губляе 760-800 спецыялістаў, — паведаміў Сяргей Сычык. — Выезд урачоў за мяжу пакуль для нас не вельмі актуальны: па даных кадравых службаў, штогод выязджаюць на працу за мяжу 68-83 чалавекі, пераважная толькі на часовую работу. Але рызыкну выказаць меркаванне, што гэта статыстыка не зусім адпавядае рэчаіснасці, таму што 300 урачоў штогод пакідаюць сваё месца працы па невядомых прычынах. Ці яны змянілі сферу дзейнасці, ці паехалі за мяжу? Мы гэтага не ведаем. Сярод урачоў, якія збіраліся выехаць за мяжу, праводзілася анкетаванне, падчас якога высветлілася, што асноўная прычына гэтага кроку — незадаволенасць сваім матэрыяльным становішчам і сацыяльным статусам.

Між іншым, для многіх еўрапейскіх краін праблема адтоку ўрачэбных кадраў за мяжу сёння стаіць надзвычай востра. Пашырэнне Еўрасаюза прывяло да таго, што ўрачы шукаюць для сябе работу з лепшымі заробкамі і ўмовамі працы.

— Безумоўна, колькасць ахвотных выехаць за мяжу значна большая, чым колькасць тых, хто гэта зрабіў, — расказала **саветнік па кадрах еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, прафесар Галіна ПЯРФІЛЬЕВА**. — І ўсё ж такі працоўная міграцыя нагадвае сёння прынцып даміно. Польскія медыкі едуць працаваць у Германію, нямецкія ўрачы — у Вялікабрытанію, а англійскія ўрачы — у ЗША, Канаду, Аўстралію і Новую Зеландыю. У Германіі сёння працуюць урачы з Расіі (самая вялікая колькасць), Ірана, Грэцыі, Аўстрыі, Польшчы, Турцыі, Румыніі, Украіны, Італіі. У Нарвегіі больш як 15 працэнтаў урачоў прыехалі з іншых краін, у Вялікабрытаніі і ўвогуле 31 працэнт. А ў Жэневе (Швейцарыя) 60 (!) працэнтаў работнікаў шпіталяў з'яўляюцца іншаземцамі. Ірландыя, якая калісьці была экспарцёрам медыцынскіх кадраў, цяпер пераўтварылася ў актыўнага іх імпарцёра — там працуе вялікая колькасць медыцынскіх сёстраў з Паўднёвай Афрыканскай рэспублікі, Уганды і г.д. Філіпіны і Індыя адносяцца да краін з крытычным дэфіцытам медыцынскіх кадраў, між іншым, Філіпіны актыўна экспартуюць у іншыя краіны свету сваіх медыцынскіх сёстраў, а Індыя — урачоў. З Кыргызстана ўрачы выязджаюць на заробкі ў Расію і Казахстан, а ў Кыргызстан прыязджаюць працаваць урачы з Туркменістана.

— Міграцыя спецыялістаў — як вірус, перад якім нельга паставіць санітарны кардон, — ўпэўнена Галіна Пярфільева. — Дысбаланс у падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў складваўся многія гады. Заможныя краіны Еўропы недастаткова сродкаў укладвалі ў падрыхтоўку медыцынскіх кадраў, і цяпер яны вымушаны цараваць «кадравыя дзіркі». Да таго ж насельніцтва Еўропы імкліва старэе, што таксама павялічвае нагрузку на нацыянальныя сістэмы аховы здароўя. Калі ў 1992 годзе працягласць кансультацыі ўрача агульнай практыкі ў Англіі складала 8,5 хвіліны, то ў 2006 годзе яна была ўжо 12 хвілін. Са старэннем насельніцтва назапашваецца і хранічная паталогія.

Сёння ўсіх хвалюе ўвядзенне Еўрасаюзам «блакітнай карты», якая дасць яе ўладальніку магчымасць працаваць на ўсёй прасторы Еўрасаюза і роўныя з грамадзянамі Еўрасаюза правы. Фактычна Еўропа адкрывае свой рынак працы для высокакваліфікаваных спецыялістаў з іншых краін. Еўрасаюз збіраецца прыцягваць у першую чаргу ўрачоў, інжынераў, спецыялістаў у галіне камп'ютарнай тэхнікі і навукоўцаў-даследчыкаў — тых, хто здольны ўнесці самы важкі ўклад у іх эканоміку. Кожная краіна будзе самастойна вырашаць, якія спецыялісты і ў якой колькасці ёй патрэбныя. Прычым «блакітная карта» будзе дзейнічаць на працягу пяці гадоў пасля вяртання работніка на радзіму, і той у любы момант зможа вярнуцца, калі для яго з'явіцца вакансія. І хоць атрымаць «блакітную карту» будзе не вельмі проста, пагроза «ўцечкі мазгоў» становіцца для многіх краін, у тым ліку і Беларусі, усё больш небяспечнай і рэальнай.

Галіна Пярфільева папярэдзіла беларускіх спецыялістаў таксама аб пагрозе празмернага драблення спецыяльнасцяў: «Пры вялікай агульнай колькасці ўрачоў забяспечанасць насельніцтва ўрачамі агульнай практыкі ў Беларусі вельмі нізкая. Між іншым, упор ва ўсім свеце робіцца на аказанне якаснай дапамогі на ўзроўні менавіта першаснай медыка-санітарнай дапамогі. Да таго ж колькі трэба выдаткоўваць сродкаў, каб пастаянна падтрымліваць прафесійную кампетэнцыю «вузкіх» спецыялістаў!»

Не абмінуў праблему штучнага «завужвання» спецыяльнасцяў і Сяргей Сычык: «Я лічу, што ўльтрагукавая дыягностыка — гэта метад, а не асобная прафесія». Увогуле ж галоўны недахоп наменклатуры медыцынскіх спецыяльнасцяў — гэта адсутнасць сістэмнасці. Недасканаласць класіфікатара ўскладняе правядзенне атэстацыі, перашкаджае якаснаму павышэнню кваліфікацыі і дапускае набыццё «вузкай» спецыяльнасці без папярэдняй агульнай спецыяльнай паслядыпломнай адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ДЗЕЦІ ЯК ЛЮСТЭРКА БАЦЬКОЎ

**Прамая лінія**

**Раскажыце, ад чаго пакутуюць вашы дзеці — ад якіх праблем, захворванняў, — і стане зразумела, што адбываецца ўласна з вамі. Вобразна кажучы, малыя з'яўляюцца той «лакмусавай паперкай», якая выяўляе любыя фізічныя і псіхалагічныя праблемы дарослых. Калі вы хочаце, каб паміж вамі і вашымі дзецьмі быў лад, каб яны менш хварэлі, менш баяліся, лепш вучыліся, больш актыўна развіваліся, пачніце работу над сваімі памылкамі — над сабой. Рабіце штодня тое, чаго патрабуеце ад сваіх дзяцей або хочаце ў іх бачыць. Спадзяёмся, наша «прамая лінія» з удзелам асістэнта кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта кандыдата медыцынскіх навук Іны ПЯТНІЦКАЙ дапаможа дарослым чытачам лепей зразумець сябе і абраць правільны шлях ва ўзаемаадносінах з дзецьмі — самай вялікай каштоўнасцю ў жыцці любога чалавека.**



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

☎ ***— Добры дзень, тэлефаную з Гомеля, завуць Антаніна Мікалаеўна. Мой сын вучыцца ў 4-м класе. Ён вельмі перажывае з-за нізкіх адзнак, якія ў яго бываюць рэдка. Акрамя таго, мы не сварымся на яго за невысокія балы, а ён усё роўна перажывае, комплексуе. Скажыце, ці можа гэты комплекс неяк адбіцца на яго характары ў будучым?***

— Размова ідзе пра залішне трывожнае і адказнае дзіця. Гэта адбываецца па шэрагу прычын. Магчыма, гэта рыса характару, якая перадалася ў спадчыну ад бацькоў, бабуль і дзядуляў, бліжэйшых сваякоў. Калі так, то такая рэч даволі ўстойлівая і будзе суправаджаць чалавека ўсё жыццё. Яшчэ як варыянт — выдаткі сямейнага выхавання. Да чацвёртага класа ўжо сфарміравалася трывалае ўяўленне аб тым, як і на што трэба вучыцца. Дапусцім, на пачатку вучобы бацькі арыентавалі хлопчыка на дасягненне высокіх сацыяльных вынікаў, а потым адступілі ад гэтых прынцыпаў. Дзеці ж больш завязлівыя на сітуацыі і па-ранейшаму імкнуцца апраўдваць чаканні бацькоў. У такім выпадку трэба або перагледзець сістэму выхавання, або звярнуцца па дапамогу да псіхолага, каб даведацца, як паводзіць сябе дарослым у гэтай сітуацыі, як рэагаваць на такія выпадкі, каб дзіця зусім не закамплексавала.

☎ ***— Званю са Смалявіцкага раёна. Завуць Кацярына. Маёй дачцэ 14 гадоў. Яна вельмі замкнёная, у класе не мае сяброў. Як можна ёй дапамагчы?***

— Зноў-такі гэта замкнёнасць можа быць рысай характару. Ці ў саміх бацькоў няма шырокага кола сяброў, і дзяўчынка проста не ведае, як трэба заводзіць дружбу з аднакласнікамі. У гэтым выпадку можна зрабіць наступнае. Не абавязкова заводзіць сяброў у класе, магчыма, там склаліся такія адносіны, што яна ўжо сапраўды не можа пасябраваць з аднакласнікамі. Але ж сябры могуць з'явіцца па-за школай: у спартыўнай секцыі, напрыклад, у творчым гуртку, там, дзе яна можа адчуваць сябе больш спакойна і камфортна. У нейкай новай групе равеснікаў у яе больш шанцаў завесці сяброў. Акрамя таго, я параіла б бацькам усёй сям'ёй часцей выходзіць у месцы, дзе шмат станоўчых эмоцый, шмат людзей, стасункаў. Гэта паходы ў тэатры, цырк, на розныя святочныя мерапрыемствы.

***— Алена з Жодзіна. Старэйшай дачцэ 10 гадоў. Яна вельмі раўнуе нас, бацькоў, да пяцігадовай малодшай. Гаворыць, што малую любім больш. Як растлумачыць ёй, што гэта не так?***

— Гэта называецца сіблінгавае суперніцтва. Яно дастаткова часта сустракаецца. Нельга сказаць, што гэта адхіленне. Часткова сітуацыя нармальная і нават адыгрывае станоўчую ролю. Такое суперніцтва рыхтуе дзіця да будучага жыцця. Бо ў будучыні прыйдзецца змагацца за ўвагу іншых людзей, за любоў навакольных, за нейкія свае асабістыя інтарэсы. Растлумачыць сёння сітуацыю дзіцяці вельмі складана. Можна толькі прадэманстраваць. Што з'яўляецца для старэйшай дачкі паказчыкам? Тое, што мама ўдзяляе аднолькавую колькасць часу абедзвюм дзяўчынкам. Размяркуйце свой час так, каб ён дастаўся дзецям пароўну. Трэба быць вельмі справядлівымі ў заахвочваннях і пакараннях. Такія прынцыпы лепей за ўсё паказваюць дзецям, што любоў — аднолькавая. А з цягам часу гэты перыяд рэўнасці пройдзе.

**«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***

**Карэспандэнт вывучаў тэму**

## ЗаБАДалі гэтыя БАДы!

### І хто вам сказаў, што яны лечаць?

У савецкія гады адным са шматлікіх заклікаў быў — ехаць будаваць БАМ! У нашы дні знаёмыя, бывае, заклікаюць купіць у іх БАДы. Маўляў, мне ж дапамагло, як і маці маёй, бацьку... Самае цікавае, што ніяк потым вы не дакажаце, што не дапамаглі нічым вам гэтыя БАДы. Ды і сам факт куплі пры канфліктнай сітуацыі як даказаць? Больш за тое, у адказ на вашы словы сумнення вам абавязкова яшчэ і параяць працягнуць курс «лячэння». Маўляў, мы ж толькі пачалі папраўляць здароўе. А вы ўжо нервуецеся чамусьці.

Каханая нечакана адразу павесялела, калі я ёй паведаміў сумную для мяне навіну — еду ў Мінск да роднага начальства, як гаворыцца, «па выкліку». Наша агульная знаёмая, аказваецца, павінна мне перадаць у сталіцы біялагічна актыўную дабаўку, каб наш старэйшы сын, якому хутка споўніцца чатыры гады, менеей хварэў. Маўляў, яе ж сыну дапамагло — хварэе цяпер толькі раз у год. Жанчына гэтая ўжо некалькі гадоў займаецца такім БАДаўскім бізнэсам. Каштуе тое, што я павінен фактычна купіць з рук, а не ў звычайнай аптэцы... ажно 84 тысячы беларускіх рублёў. Спрачацца з каханай я не стаў — праверана: толькі час траціць дарма. Толькі спытаў: а ці легальна яна іх прадае? У адказ: «Думаю, так». Безумоўна, мінчанка, дарэчы, нават не медсястра, а інжынер зноў атрымае свой працэнт ад сумы. Ну як не дапамагчы фінансава жыхарам сталіцы? Самае смешнае, што такі ж «цуд» можна купіць у яе «калег» па цэху, распаўсюджвальнікаў. Ды не дае віцебскі тэлефон, ёй жа гэта нявыгадна! Хоць, як я даведаўся, у любым выпадку яна павінна атрымаць «прэферэнцыю» ад свайго начальства за пакупку з боку чарговага кліента. Ды, відаць, не вельмі дружныя гэтыя распаўсюджвальнікі. І давядзецца ж купіць гэтыя БАДы ў Мінску.

Многія з маіх знаёмых альбо іх сваякі хоць раз у жыцці ды куплялі ў такіх жа гандляр ак — у большасці выпадкаў вельмі далёкіх ад медыцыны людзей, розныя дабаўкі. І мяне вельмі хацелі ўцягнуць у бізнэс.

— А, журналіст! Вось гэтыя дабаўкі вельмі павышаюць жыццёвы тонус, ды з жанчынамі будзе яшчэ лепей. Вы ж ужо не юнак. У вас жа столькі, напэўна, кожны дзень кантактаў, новых знаёмстваў. Далучайцеся да нас, — пачуў я ад сяброўкі жонкі. І экстэрнам «скончыў» міні-курс па распаўсюджванні. Зразумеў, што чым болей рэалізуеш, тым па меншай цане потым будзеш атрымліваць на рэалізацыю тавар. Балы, «тытулы» — усё як у вядомых сетках па распаўсюджванні, і невядомых таксама. Пачуў я, што ў некаторых краінах БАДы прадаюцца ў звычайных харчовых крамах...

Тое як у нас пастаўлены на паток працэс «лячэння» БАДамі, я ўбачыў на свае вочы. Даверылі! Прафесійны медык прыехала з Мінска да вопытнага «члена групы» па распаўсюджванні дабавак. Апошняя перад яе прыездам здолела ўгаварыць некалькіх сяброўак і іх сваякоў прыйсці па кансультацыю. Зразумела, бясплатную. А як жа інакш? Некаторыя з запрошаных, дарэчы, не прыйшлі, чым вельмі «абурылі» гаспадыню. Падчас размовы з «кліентамі» медык параіла ім некалькі сродкаў, каб паправіць здароўе. У выніку некалькі сотняў долараў былі выкладзены на «лячэнне». Не адразу, вядома ж. Паэтапна. Што мяне здзівіла, дык гэта прапанова пакупнікам праз год, два паўтарыць курс, «каб ужо ніколі праблемы пра сябе не нагадвалі».

Пытанне — а чаму дабаўкі нельга купіць у аптэцы? — было адназначна пракаментавана прыкладна так: наша фірма працуе па сваім прынцыпе і гарантуе продаж высакаякасных дабавак амерыканскай вытворчасці напрамую без пасрэднікаў. Яны ж у аптэцы каштавалі б адназначна даражэй.

Вось адзін са слоікаў, дзе на этыкетцы ў ліку іншага надрукаваны нейкі нумар і дата, а далей напісана: «Міністэрства аховы здароўя Расійскай Федэрацыі» (дзяржаўны дазвол на рэалізацыю?). Знаёмы падатковы інспектар па маёй просьбе пракаментавала гэта так: «Такім чынам, верагодна, распаўсюджвальнікі гэтых БАДаў проста пазбягаюць «лішніх» падаткаў». Схема простая — з маскоўскага склада оптам прывозіцца нейкі БАД, на рэалізацыю якога насамрэч ёсць дазвол з боку расійскага міністэрства. А мо і няма. Надрукаваць на этыкетцы можна, што душа пажадае. Пакупнікі ў суседняй Беларусі наўрад ці будуць цікавіцца такімі «дробязямі». Тут працуюць распаўсюджвальнікі, і ўсім ім не трэба рэгістравацца ў якасці прадпрымальнікаў. Бярэ ў «галоўнага» пілюлі, атрымлівае працэнт. Усе задаволеныя.

Як ставіцца да таго, што ўрачы, бывае, самі займаюцца гэтым бізнэсам прама на рабоце? Просьба да аднаго вельмі мною паважанага мясцовага чыноўніка ад медыцыны пракаментаваць такія факты, калі ўрачы ў сваіх кабінетах прапаноўвалі дабаўкі, якія не прадаюцца ў аптэках, засталіся, на жаль, без каментарыя. Урач таксама чалавек — хоча жыць не толькі на адну зарплату. Між іншым, спецыялістам вядома, што дабаўкі проста дапамагаюць арганізму супраціўляцца інфекцыям, паляпшаюць функцыянаванне нейкіх сістэм, але ніякім чынам не лечаць.

Суседка-медык, якая ўжо гадоў дзесяць на пенсіі, паскардзілася на тое, што не хоча яе слухаць унучка — літаральна штомесяц прыкладна 30-40 працэнтаў зарплаты траціць на набыццё БАДаў для пахудзення. Звестак аб так званай дзяржаўнай айчыннай гігіенічнай рэгістрацыі на гэтых «пілюлях» няма. Ды і як можна ўжываць самастойна тое, што, магчыма, і гарантуе паніжэнне вагі, але, безумоўна, не лепшым чынам уплывае на арганізм у цэлым? Безумоўна, у ідэале трэба параіцца з асабістым урачом у паліклініцы, які заўсёды пры жаданні можа яшчэ раз перагледзець вынікі вашых аналізаў, ведае агульны стан здароўя, каб прапанаваць нешта з БАДаў купіць у аптэцы. А ніяк не з рук!!! А «выпадковы» ўрач, як тая са сталіцы, — адкуль усё гэта ведае? Праўда, могуць прапанаваць прыехаць у Мінск, каб здаць тыя ж аналізы альбо пры нейкай медыцынскай фірме, альбо і дома. Так што няпростыя гэтыя «лідары» па распаўсюджванні БАДаў. Вельмі разумныя.

«Ідэальная вага». Заўважана, што тыя ж пілюлі для пахудзення памяншаюць адчуванне голаду, адпаведна арганізм можа «перабудавацца» і ў выніку «штучнага галадання» не атрымліваць своечасова тое, у чым мае патрэбу. І разам з памяншэннем тлушчу гарантавана наогул памяншэнне ўжывання і карысных рэчываў. Ці не прасцей запісацца ў фітнэс-клуб?





БАДы пры набыцці ў аптэцы, калі іх правільна ўжываць, і насамрэч нічым не пагоршаць здароўе. Таму іх там прадаюць. Верагодна, купляюць БАДы з рук таму, што пагадзіцеся, многія ўрачы чамусьці наогул не рэкамендуюць сваім пацыентам іх купляць у аптэках. Ды і ў цэлым, так ужо здарылася, што мы — прафаны ў гэтым пытанні.

Хочацца вельмі, каб айчынныя вытворцы здолелі ўвайсці ў барацьбу за спажыўца. Калі б па тэлебачанні больш актыўна рэкламавалі тыя ж БАДы — беларускія, няўжо мы не куплялі б іх? І не папаўнялі б у выніку амерыканскі і расійскі бюджэты, фінансуючы з уласнай кішэні добра прадуманыя схемы дастаўкі і распаўсюджвання.

І тым, што мала мы разумеем у гэтых самых БАДах, вядома ж, не могуць не скарыстацца распаўсюджвальнікі, для якіх «дапамагчы» нам з вамі — бізнэс. Не больш за тое. Нядрэнны, дарэчы, занятак, каб зарабіць лёгкія грошы. І добра, калі эфект ад БАДаў, што яны прадаюць, будзе такім жа, як ад мінеральнай вады. Яна ж таксама дапамагчы можа пры гастрыце, напрыклад, а каштуе не так дорага. І каб набыць яе, у той жа Мінск не трэба да знаёмых ехаць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## БАДы не заўсёды карысныя

**паведаміла наместнік дырэктара Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі па навуковай і інавацыйнай рабоце, доктар біялагічных навук, прафесар Кацярына СЛАБАЖАНІНА.**

На беларускім рынку прадстаўлены шырокі спектр БАДаў, багатых на розныя мікраэлементы. «Аднак трэба дакладна ведаць, у якіх мікраэлементах мае патрэбу ваш арганізм і як граматна папоўніць гэты недахоп, — адзначыла спецыяліст. — Напрыклад, такія карысныя мікраэлементы, як цынк і селен неабходныя кожнаму чалавеку, але калі іх канцэнтрацыя перавышае гранічна дапушчальны ўзровень, гэта можа негатыўна адбіцца на здароўі».

Паводле слоў Кацярыны Слабажанінай, у цяперашні час вучоныя Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі выконваюць навуковы праект па даследаванні ўплыву таксічных металаў на арганізм жанчын. Гэтыя работы вядуцца пад патранатам МАГАТЭ. «Кожная клетка нашага арганізма мае пэўную ступень самаабароны ад таксічных элементаў. Гаворка ідзе аб здольнасці вызваляцца ад шкодных рэчываў, так званай дэтаксікацыі, — патлумачыла вучоны. — Мы вывучаем механізм гэтай абароны, а таксама спосабы яе ўмацавання». У перспектыве на базе інстытута плануецца стварыць новую акрэдытаваную лабараторыю па даследаванні ўтрымання высокатаксічных і патэнцыяльна таксічных мікраэлементаў у жывых арганізмах. Атрыманыя звесткі будуць прымяняцца ў медыцыне, экалогіі, ветэрынарыі.

**Вольга БЯЛЯЎСКАЯ, БЕЛТА.**

## Найстарэйшай грамадзянцы Беларусі, якая пражывае ў Польшчы, 105 гадоў

Консульскі работнік беларускага пасольства ў Польшчы ўручыў пашпарт Браніславе Іванаўне Гайжэўскай.

Паводле інфармацыі прэс-службы пасольства, Браніслава Іванаўна — найстарэйшая грамадзянка Беларусі, якая пражывае ў Польшчы. Яна нарадзілася 20 чэрвеня 1903 года ў Гродзенскай губерні, затым, ужо ў Гродзенскай вобласці, працавала ў калгасе, а ў 1979 годзе выехала ў Польшчу па запрашэнні сына. У Браніславы Іванаўны трое дзяцей, дзевяць унукаў, пятнаццаць праўнукаў і пяць прапраўнукаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПЕРШЫЯ ПРЫКМЕТЫ АСТЭААРТРОЗУ

### МОГУЦЬ З'ЯВІЦЦА ЎЖО ВА ЎЗРОСЦЕ 30—35 ГАДОЎ

**Праблемы захворванняў апорна-рухальнага апарата сёння ва ўсім свеце лічацца актуальнымі. Яны не толькі шырока распаўсюджаныя, але і часта з'яўляюцца прычынай інвалідызацыі, займаючы другое месца пасля ішэмічнай хваробы сэрца.**

**Невыпадкова сусветнае супольніцтва прысвяціла Міжнародную дэкаду з 2000 па 2010 год, касцёва-сустаўным парушэнням. Гэта акцыя накіравана на аказанне сістэмнай і дзейснай дапамогі людзям, якія маюць захворванні апорна-рухальнага апарата.**

**Сёння аб адной з такіх паталогій — астэаартрозе — мы гутарым з доктарам медыцынскіх навук, прафесарам кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі БелМАПА Тамарай ЦЯБУТ.**

— Гэта захворванне найбольш ярка праяўляецца ў больш старэйшых узроставых групах. Пацыенты, якім больш за 75 гадоў, практычна ў 95 працэнтах маюць прыметы астэаартрозу рознай лакалізацыі. Аднак гэта зусім не азначае, што астэаартроз — хвароба толькі людзей ва ўзросце. Першыя прыкметы астэаартрозу могуць з'явіцца ўжо ва ўзросце 30—35 гадоў.

***— Як праяўляецца захворванне і калі чалавеку з гэтай прычыны трэба звяртацца да спецыяліста?***

— Для астэаартрозу характэрны боль, які парушае функцыянальныя магчымасці чалавека пры хадзе альбо працы, працяглым знаходжанні ў адным становішчы. У залежнасці ад лакалізацыі гэтага паталагічнага працэсу боль можа быць у каленных, тазасцегнавых ці іншых суставах канечнасцяў або пазваночніка.

Астэаартроз найбольш часта пашкоджвае суставы ног (каленны, тазасцегнавы), паколькі яны маюць большую нагрузку. Церпяць і дробныя суставы кісцяў, апошняе часцей бывае ў жанчын, а таксама суставы пазваночніка. Але, безумоўна, паталагічны працэс можа лакалізавацца ў любым суставе. Гэта захворванне, для якога характэрная неадпаведнасць нагрузкі, якую адчуваюць суставы, функцыянальным магчымасцям чалавека. Зразумела, усе мы розныя і падрыхтаваны да рознага ўзроўню нагрузак.

Скажам, чалавек кволага целаскладу з празмерным аб'ёмам рухаў адчувае павышаную нагрузку на суставы. Адпаведна ў яго гэтыя суставы будуць зношвацца хутчэй.

Ці пацыент у маладосці меў дэфіцыт масы цела, а з узростам набраў вагу. Зразумела, і яго суставы адчуваюць большую нагрузку за кошт залішняй масы цела і хутчэй будуць зношвацца.

У людзей цяжкай фізічнай працы ці працы са стэрэатыпнымі рухамі, напрыклад, грузчыкаў, вадзіцеляў, ткачых, даярак, аператараў-камп'ютаршчыкаў нагрузка на пэўныя групы суставаў таксама ўзрастае.

Пацыенты звяртаюцца да спецыяліста тады, калі ў іх ужо ўзнік боль у пашкоджаным суставе. Але гэта позні зварот. У астэаартрозу ёсць перыяд часу, калі ён працякае бессімптомна. І чым пазней да нас прыходзіць чалавек, тым менш шанцаў на поўнае зваротнае развіццё гэтага паталагічнага працэсу. Мы толькі можам стабілізаваць цячэнне захворвання на пэўным этапе, а павярнуць працэс назад тэрапеўтычнымі метадамі пакуль немагчыма.

Таму чым раней да нас звяртаецца пацыент, тым больш шанцаў на стабілізацыю.

***— Якія фактары рызыкі існуюць для развіцця астэаартрозу?***

— Па-першае, ёсць спадчынная схільнасць. Дастаткова часта па жаночай лініі перадаецца вузельчыкавая форма захворвання. Пры ёй на пальцах рук утвараюцца т. зв. вузельчыкі Гебердэна, Бушара. Раптам жанчына заўважае, што ў яе змянілася форма пальцаў, нават і пярсцёнак можа не надзець, і яна ўспамінае, што і ў бабулі, і ў маці былі такія ж змяненні.

Другі фактар рызыкі звязаны з анамальнай будовай злучальнай тканкі. А менавіта яна найбольш шырока прадстаўлена ў чалавечым арганізме. І яе спецыялізаваныя разнавіднасці — косная і храстковая тканкі, могуць мець пэўную анамальную пабудову, што змяншае ўстойлівасць да нагрузак. Звычайна ў гэтых людзей маюцца знешнія прыкметы такіх анамалій: дэфіцыт масы цела, плоскаступнёвасць, скаліёз, павышаная расцяжнасць скуры. Хвароба на гэтым фоне, а калі яна яшчэ спалучаецца з павышанымі нагрузкамі, можа развіцца ў больш маладым узросце.

Зараз мы дастаткова часта сустракаемся з паталогіяй эндакрыннай сістэмы. У першую чаргу размова ідзе аб жаночай палавой сферы. Напрыклад, лячэнне, звязанае з выдаленнем яечнікаў, наступленне ранняй менапаўзы. Гэты перыяд таксама ўразлівы для развіцця паталогіі апорна-рухальнага апарата, для парушэння структуры коснай і храстковай тканак. Неабходна, каб такія пацыенткі назіраліся гінеколагам і эндакрынолагам.

***— Якія метады прафілактыкі і лячэння астэаартрозу існуюць сёння?***

— Увесь свет надае асноўную ўвагу менавіта немедыкаментозным метадам прафілактыкі і лячэння. Сярод іх — навучанне пацыента, якое дапаможа яму пашырыць уласнае ўяўленне аб структуры апорна-рухальнага апарата і яго функцыях. Існуе такое паняцце, як дыяпазон рухальных практыкаванняў. Трэба ведаць, што ёсць практыкаванні, якія шкодныя для суставаў. Напрыклад, пад'ём па лесвіцы — найбольш неспрыяльны від руху для суставаў, хадзіць лепш па роўнай мясцовасці. Яшчэ. Доўгае стаянне на каленках — гэта той фактар, які даволі часта выклікае болевы сіндром у каленных суставах.

А вось каб захаваць нармальны мышачны тонус, пацыент абавязкова павінен рабіць ранішнюю гімнастыку. Гэтак жа як прачынаецца наш мозг, прачынаецца і цела. Трэба дапамагчы яму ў гэтым. Нельга адразу ўскокваць з ложка на ногі, як толькі празвінеў будзільнік. Паглядзіце, як паводзяць сябе кошкі. Ні адна з іх не саскочыць з канапы, пакуль не пацягнецца. Так павінен паводзіць сябе і чалавек. Пастаўце будзільнік на пяць хвілін раней і «разбудзіце», лежачы, усе свае суставы. Зрабіце мінімальны аб'ём рухаў, каб палепшыўся крываток і ў суставах з'явілася сінавіяльная вадкасць, якая забяспечвае мінімальнае трэнне сустаўных паверхняў і адпаведна змяншае іх пашкоджанне.

У якасці прафілактыкі артрозаў рэкамендуецца выкарыстоўваць падручныя сродкі: супінатары, артэзы, передплечныя мыліцы, якія ўмацоўваюць сустаў і дапамагаюць стомленым мышцам. Не саромейцеся карыстацца палачкай для апоры пры хадзе.

Медыкаментознае лячэнне артрозаў сёння ідзе па двух напрамках. З аднаго боку, прымяняюцца сродкі, якія паляпшаюць якасць жыцця хворага, яны здымаюць болевы сіндром. Гэта сімптомамадыфікуючыя прэпараты хуткага дзеяння. Іх сёння шмат. Аднак прызначаць гэтыя лекі павінен толькі ўрач, кожнаму пацыенту — індывідуальна.

З другога боку, прымяняюцца так званыя структурнамадыфікуючыя прэпараты запаволенага дзеяння. Яны закліканы прытармазіць далейшае пашкоджанне храстковай і коснай тканкі. Безумоўна, нельга чакаць ад іх дзеяння адразу цуду. Іх трэба прымаць працягла, нават гадамі. Няхай з перапынкамі, але курсы лячэння павінны абавязкова паўтарацца. Гэта дазволіць прыпыніць развіццё паталогіі, асабліва на ранніх этапах.

З'яўляюцца і новыя напрамкі ў лячэнні астэаартрозу. Напрыклад, створаны прэпараты, якія блакуюць так званыя медыятары запалення, што прымаюць удзел у пашкоджанні храстковай тканкі. Гэта прэпараты расліннага паходжання з соі і авакада.

Хачу звярнуць увагу і на тое, што паколькі ў структуру сустава ўваходзіць і храстковая, і косная тканкі, то дастаткова часта ў арганізме пацыента праходзяць два працэсы: і астэаартроз, і астэапароз. Таму шэраг прэпаратаў, якія выкарыстоўваюць для прафілактыкі і лячэння астэапарозу, знаходзяць сваё месца і ў лячэнні астэаартрозу. Размова ідзе аб прэпаратах вітаміну $D_3$.

Выкарыстоўваюцца і хірургічныя метады лячэння — замена хворага сустава, артраскапічныя метады лячэння. Сярод іх імплантацыя хандрацытаў — клетак храстковай тканкі: у зону пашкоджання храстка для таго, каб гэтыя клеткі стваралі структурныя элементы храстковай тканкі. Аднак апошні метад патрабуе далейшага клінічнага вывучэння. Тактыку лячэння павінен вызначыць урач.

***— Да якога канкрэтна спецыяліста трэба звяртацца чалавеку, які мае сімптомы астэаартрозу?***

— Пажадана, каб першы зварот быў да ўрача-рэўматолага. Аднак, на жаль, сёння з гэтым праблемы. У нашай рэспубліцы пакуль такіх спецыялістаў вельмі мала, прыкладна каля 100 чалавек. А пацыентаў, якія маюць астэаартроз, прыкладна 1,5 млн чалавек. Таму звяртацца трэба да ўчастковага ўрача-тэрапеўта ці хірурга, якія вызначаць неабходнасць далейшых кансультацый і лячэння ва ўрача-спецыяліста.

# «Мы жывём у Беларусі — значыць павінны ведаць беларускую мову...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Але ж у актавай зале райвыканкама, дзе праходзіла сустрэча, мова гучала. І ў поўны голас. Хай коратка, але ж нам трэба было расказаць пра гісторыю больш чым дзевяностагадовай «Звязды», пра яе дзень сённяшні, пра калектыў, змест. Знайшлося месца і добраму вершу, і беларускаму народнаму гумару.

Шчыра скажам, даўно не было ў нас такой прыгожай, такой удзячнай аўдыторыі!

Не магло не радаваць і тое, што перад уваходам у залу працавалі супрацоўніцы пошты — любы з ахвотных мог тут жа аформіць падпіску на выданне, якое яго цікавіць.

Ці зацікавіла каго «Звязда» (настолькі, каб узяць ды і падпісацца), на жаль, не ведаем, але ж спадзявацца на гэта хочацца. Бо, як здалося, пакуль што (!) ёсць у тутэйшых людзей патрэба (падкрэслім гэтае слова) чуць сваю жывую родную мову, чытаць на ёй.

...Менавіта яна, гэтая патрэба, гадоў з 20 таму «прывяла» да «Звязды» жыхарку вёскі Лучын, што ў суседнім Рагачоўскім раёне, Соф'ю Парфір'еўну Кусянкову. Многім чытачам, упэўнены, знаёмае гэта прозвішча па «байках» у рубрыцы «Алё, народ на провадзе!», па вершах на конкурс «Хто каго?», па вопыце вырошчвання баклажанаў, якім са старонак газеты дзялілася гэта знакамітая агародніца. Таму, праязджаючы праз вёску, дзе яна жыве, грэх было не зазірнуць на яе падворак, грэх не пабачыць новыя творы. Не здзіўляйцеся, але гэта невялічкая (ростам) жанчына (да ўсяго!) — цудоўны майстар... па дрэве. Дошкі, палічкі, вешалкі, мацунак для карнізаў — амаль усё ў яе ўтульным доме зроблена сваімі рукамі. А ўжо ўслончыкі... Без перабольшвання — творы мастацтва і як жывыя!

Яшчэ адно захапленне Соф'і Парфір'еўны — фатаграфія, яшчэ адно — музыка...

Карацей, пра гэтага чалавека чытачам, ну безумоўна ж, варта расказаць падрабязней (падчас гэтай сустрэчы часу на інтэрв'ю, на жаль, не мелася...)! Але ж нам прыемна было хоць крыху пагасціць у сваёй актыўнай аўтаркі і шчырай прыхільніцы-прапагандысткі, засведчыць сваю павагу і, магчыма, за кошт гэтага візіту, не зусім звычайным зрабіць не толькі дзень нашага жыцця, але, спадзяёмся, і яе.

...Кароткія, але ж прыемныя і патрэбныя сустрэчы адбыліся ў нас і па дарозе далей — у самім Рагачове, у Буда-Кашалёве, у Гомелі, дзе ў той жа вечар 90-годдзе з дня ўтварэння (зазначым — на вельмі добрым узроўні!) святкаваў «Гомельаблсаюздрук». Павітаць гэты (усе эпітэты ад выступоўцаў) працавіты, зладжаны, адказны, добрасумленны, прыгожы (у большасці сваёй жаночы) калектыў з'ехаліся прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, абл-, гар- і райвыканкамаў, дзелавыя партнёры. А значыць, у наяўнасці было проста мора добрых слоў (захаплення, удзячнасці, павагі), мора ўзнагарод, пажаданняў, кветак-падарункаў... Для ўдзельнікаў быў наладжаны вялікі, прадуманы да драбніц святочны канцэрт...

Адзінае, чаго (як нам здалося) крыху бракавала — гэта гумару. І таму...

Ну дзе, як не ў Гомелі трэба было ўзгадаць пра недалёкія адсюль Аўцюкі? Начальства там адну з гаспадарак нядаўна наведала, стала пытаць, чаму азімыя не ўзышлі? «Ды разумееце, — трымаў справаздачу старшыня СВК, — спачатку былі дажджы, потым — даў марозік, потым зноў дажджы... Надвор'е падвяло». «Можа б, цікавейшае што прыдумаў?» — перапынілі яго «рэвізоры». «Добра, — згадзіўся аўцюк, — я тады праўду скажу: пасеяць забыліся».



*Гадзіннік з лагатыпам «роднай газеты на роднай мове» ўручаны начальніку ідэалагічнага аддзела райвыканкама Галіне Уладзіміраўне МЕЛЬНІКАВАЙ.*

Прыехаўшы, можна сказаць, у госці, на свята да тых, хто штодзённа прадае чытачам нашу газету (і, зразумела ж, іншыя), мы палічылі сваім абавязкам «пасеяць» павагу і цікавасць да яе, падарыць зале сапраўдны шчыры смех.

Без перабольшвання скажам, што гэта ўдалося. Больш за тое, мелі шчасце, лічы, адразу ж убачыць і, так бы мовіць, першыя «ўсходы».

Пасля ўрачыстасцяў кіяскёры расказвалі нам пра тых, хто пастаянна купляе нашу газету ў іх шапіках, зацікаўлена раілі, мо частку матэрыялаў даваць па-руску, каб зацікавіць новых чытачоў ці памяняць фармат («з вялікай газетай у аўтобусе-тралейбусе не дужа разгорнешся»)... Што яшчэ прыемней, абяцалі, па магчымасці, прапагандаваць адзіную штодзённую, беларускамоўную. Каб жыла Мова, якую (гэтага не схаваеш) з задавальненнем слухалі, каб жыла старэйшая (нават за іх 90-гадовае прадпрыемства!) газета.

Хочацца верыць, што пасля гэтых сустрэч кола сяброў яе хоць крыху пашырэе (ці хоць бы не стане вузейшым!), што тыя, хто аднойчы абраў яе, не здрадзяць — будуць чытаць, будуць размаўляць па-беларуску. Інакш (Зінаідзе Канстанцінаўне Маліноўскай, настаўніцы вышэйшай катэгоры, верыць жа трэба?) мову не вывучыць — ні англійскую, выкладанню якой яна аддала без малога 40 гадоў жыцця, ні беларускую.

**Валянціна ДОЎНАР,**
**Уладзімір ПЕРНІКАЎ,**
**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**
*Мінск—Жлобін—Рагачоў—Буда-Кашалёў—Гомель—Мінск.*

# Дырыжорская палачка Пятра Чайкоўскага

**Яе і многія іншыя асабістыя рэчы сусветна вядомага кампазітара можна ўбачыць у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.**

Там праходзіць выстаўка «П.І. Чайкоўскі. Выбраныя старонкі жыцця і творчасці», пабудаваная на рарытэтах, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным Доме-музеі П. Чайкоўскага ў г. Клін. Сярод экспанатаў — асабістыя рэчы кампазітара, кнігі і ноты з яго бібліятэкі, фрагменты рукапісаў, фотаздымкі, творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. А таксама цыліндр, набыты ім у Лондане за некалькі месяцаў да смерці, французскія лайкавыя пальчаткі, пенснэ, кій, дарожныя рэчы — куфар, футарал-кардонка для двух цыліндраў, якія суправаджалі кампазітара ў яго шматлікіх паездках па расійскіх і замежных гарадах.

Як паведамілі рэдакцыі супрацоўнікі музея, выстаўка будзе працаваць да 30 лістапада.

**Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.**



## Навіны культуры

### ВЫСТАЎКА КАВАЛЬСТВА І ВЫЦІНАНКІ

**адкрываецца сёння ў Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці (вул. Гікалы, 4).**

У выстаўцы «Вобразы з металу і паперы» бяруць удзел майстры выцінанкі і кавалі, члены Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці. Наведвальнікі змогуць пераканацца, што розныя па якасці матэрыялы выдатна спалучаюцца паміж сабой.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў цэнтры народнай творчасці, выстаўка будзе працаваць да 17 снежня.

**Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже объектов, находящихся в государственной собственности, и на право заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества с условиями, с установлением начальной цены продажи неиспользуемого имущества, равной одной базовой величине**

Аукцион состоится **23 декабря** в 15.10 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

**Организатор аукциона:** фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 311185, 223375, 311216, 229022.

**Продавцы недвижимого имущества:** по лоту № 1 – Могилевское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 59, тел. 8(0222) 220837, 213760; по лоту № 2 – Могилевское коммунальное областное унитарное производственное предприятие «Облтопливо», г. Могилев, ул. Космонавтов, 17, тел. 8(0222) 283465, 210284.

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами 19 декабря 2008 г. до 17.00.

| № лота | Сведения о предмете аукциона | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о недвижимом имуществе | | | Информация о земельном участке | | |
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена продажи недвижимого имущества, тыс. руб.* | Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. |
| 1 | **Капитальное строение (аптека № 57)** одноэтажное общей площадью 81,0 кв.м, фундамент кирпичный, стены деревянные, облицованные кирпичом, перекрытия деревянные, кровля шиферная; **капитальное строение (сарай)** одноэтажный общей площадью 16,3 кв.м, фундамент бетонный, стены блочные, кровля шиферная | Могилевская обл., Горецкий район, д. Коптевка, ул. Темнолесская | 70,000 | 0,0656 | 25 | 12,195 |
| **Начальная цена продажи предмета (лота) аукциона 82,195 тыс. руб. Сумма задатка 8,000 тыс. руб.** | | | | | | |
| 2 | **Хранилище** (инв. № 1/105) площадью 582,6 кв.м, фундамент – железобетонные столбы, стены, ворота и кровля металлические, пол бетонный | Могилевская обл., Могилевский район, д. Салтановка | 35,000 | 0,1451 | 50 | 631,305 |
| **Начальная цена продажи предмета (лота) аукциона 666,305 тыс. руб. Сумма задатка 60,000 тыс. руб.** | | | | | | |

** – начальная цена продажи входящего в состав лотов недвижимого имущества определяется исходя из размера базовой величины, установленного законодательством на дату проведения аукциона.*

**Условия продажи недвижимого имущества:**

по лоту № 1 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах и создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи;

по лоту № 2 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте в течение 3 лет с даты заключения договора купли-продажи; создание в течение 2-х лет с даты заключения договора купли-продажи 3-х новых рабочих мест; запрещение покупателю продажи или иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Условия для победителя аукциона по лоту № 1: получение в установленном порядке разрешения Горецкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Задатки перечисляется на расчетные счета в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050 фонда «Могилевоблимущество»: по лоту № 1 – р/с № 3642900001315; по лоту р/с № 2 – № 3642008661325.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

негосударственным юридическим лицом – доверенность, выданная представителю негосударственного юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;

представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе представители негосударственных юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона.

Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;

ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;

ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После аукциона его участники обязаны вернуть аукционные номера организатору аукциона.

Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики недвижимого имущества, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона.

Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Торги начинаются по цене, сформированной с учетом шага аукциона, определяемого аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета аукциона. Очередная цена также определяется и объявляется аукционистом с учетом шага аукциона от предыдущей названной цены предмета аукциона. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на этого участника аукциона. Затем аукционист в соответствии с вышеназванным порядком и шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным словом «продано», а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

При отсутствии участников аукциона, готовых приобрести предмет аукциона по названной аукционистом новой цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион по данному предмету аукциона завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера. Комиссия (организатор аукциона) снимает предмет аукциона с торгов.

Споры, возникшие в ходе проведения аукциона, разрешаются комиссией по проведению аукциона.

Результаты аукциона по конкретному предмету аукциона могут быть аннулированы организатором аукциона в случаях, установленных нормативными правовыми актами.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи и договора аренды земельного участка не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона, а также средства, затраченные организацией по землеустройству на осуществление государственной регистрации изменения земельного участка, из которого изымается часть, или прекращения существования земельного участка.



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
### объекта долевого строительства

**ООО «ДИНАСИСТЕЙТ»** информирует юридических и физических лиц о создании **объекта долевого строительства.**

**ЗАСТРОЙЩИК (заказчик) – ООО «ДИНАСИСТЕЙТ»**

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 28 сентября 2000 г. № 1097, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100984486. Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. Крупская, д. 23 и д. 25, ул. Кулешова, д. 76.

**Адрес:** 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, помещение 1, комната 12, телефон 2245129. Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Цель проекта строительства** – исполнение решений Мингорисполкома «Об изъятии и предоставлении земельного участка и разрешении строительства» № 251 от 14 февраля 2008 г. и № 539(1) от 20 марта 2008 г. на строительство объекта «Жилые дома № 4 и 5 (не относящиеся к домам повышенной комфортности) по генплану по ул. Крупской с устройством административных помещений в цокольных этажах в составе объекта «2-я очередь реконструкции жилой усадебной застройки в границах ул. Плеханова – Малинина – Крупской – прибрежной зоны р. Слепянка».

**Объект долевого строительства** – жилые дома (ж/д № 4 по генплану – 3-х секционный, ж/д № 5 по генплану – 2-х секционный) представляют собой 4-этажные жилые дома с размещением в цокольном этаже административных помещений и квартирами на 4-м этаже в двух уровнях. Здания запроектированы на основе безригельной каркасной системы с плоскими монолитными дисками перекрытия. Каркас и перекрытия – монолитный железобетон. Наружные стены и внутренние перегородки – керамзитобетонные блоки. Оконное заполнение и остекление лоджий – изделия ПВХ. Кровля – плоская, покрытие – рулонные материалы. Проезды, площадки, тротуары – асфальтобетон, тротуарная плитка. Для отопления жилого дома принята поквартирная система с установкой индивидуальных источников отопления. Высота этажа – 2,7 м. Наружная отделка – утепление стен, штукатурка, покраска акриловыми красками. Цоколь здания – облицовка естественным камнем.

**Жилая часть:** общая площадь квартир за вычетом площади передаваемой Мингорисполкому в счет усредненного сноса – 4781 м² (56 квартир).

**Административная часть:** общая площадь помещений – 900,86м².

Общая стоимость жилой части и административных помещений в базисных ценах 1991 г. составляет 6608,517 тыс. руб.

**Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию:**

межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

***Для заключения договоров долевого строительства предоставляются:***

А) Квартиры в жилом доме № 4 по генплану:

- трехкомнатная, третий этаж, вторая секция, площадь квартиры по СНБ 3.02.04-03 – 86,04 м² – стоимость 291 916 440 рублей.
- трехкомнатная, второй этаж, первая секция, площадь квартиры по СНБ 3.02.04-03 – 86,04 м² – стоимость 291 916 440 рублей.
- однокомнатная, третий этаж, вторая секция, площадь квартиры по СНБ 3.02.04-03 – 44,58 м² – стоимость 160 232 040 рублей.

Начало строительства многоквартирных жилых домов – 1-й квартал 2008 г., окончание – 2-й квартал 2009 г.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

**Застройщиком получены:**

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора земельного участка от 11 мая 2007 г. и от 11 сентября 2007 г.;
- решения Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2008 г. № 251, от 20 марта 2008 г. № 539 (1) о разрешении строительства объекта;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3424 от 03.06.2008 г.;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3425 от 03.06.2008 г.;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3426 от 03.06.2008 г.;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него № 500/31-3427 от 03.06.2008 г.;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Белгосэкспертиза МАС» от 13 февраля 2008 г. № 381-7/08;
- государственная экологическая экспертиза объекта от 20 ноября 2007 г. № 715-2007;
- договор строительного подряда № 25/02-2008 от 19 февраля 2008 г. с ИП «Восточная строительная компания»;
- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 26.03.2008 г. № 2-201-Ж-062/07.

Объект находится в залоге у банка для обеспечения исполнения обязательств Застройщика по кредитному договору на финансирование строительства объекта. Застройщик обязуется при условии своевременной и полной оплаты Дольщиком объекта долевого строительства передать его Дольщику свободным от каких-либо обременений.

УНП 100984486



## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»
### «28» ноября 2008 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион

**по продаже объектов коммунальной собственности Узденского района, принадлежащих на праве хозяйственного ведения районному унитарному предприятию «Узденское ЖКХ», и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для их обслуживания**

**На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий**:

Проходную завода (инв. № 623/С-7648), общей площадью 22,1 кв.м; склад (инв. № 623/С-7678), общей площадью 232,6 кв.м; склад (инв. № 623/С-7680), общей площадью 234,4 кв.м; котельную (инв. № 623/С-7677) с дымовой трубой, общей площадью 306,4 кв.м; модуль «Орск» (инв. № 623/С-7679), общей площадью 875,0 кв.м; цех картофелепродуктов и квасное отделение (инв. № 623/С-7649), общей площадью 1856,4 кв.м; спиртохранилище (инв. № 623/С-7814), общей площадью 131,4 кв.м; оборудование котельной (30 единиц), оборудование цеха картофелепродуктов (3 единицы), расположенные по адресу: Минская область, г. Узда, пер. Заводской, 1, и **право заключения договора аренды земельного участка**, отведенного для их обслуживания, площадью 3,4173 га, сроком на 99 лет. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной и прибрежной зоне реки Уздянка. **Начальная цена** предмета аукциона 771 977 085 рублей (в том числе: имущество – 600 599 490 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 171 377 595 рублей). Сумма задатка предмета аукциона 50 000 000 руб.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 17 июля 2008 г. № 131.**

Договор купли-продажи имущества и договор аренды земельного участка с победителем аукциона будут заключены после внесения победителем аукциона платы, взимаемой за право заключения договора аренды земельного участка, возмещением затрат по подготовке и проведению аукциона, а также расходов, связанных с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка.

Оплата за объекты и право заключения договора аренды земельного участка должны быть произведены победителем аукциона до 30 декабря 2008 года.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686. Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09, (8 01718) 55845.** Последний день подачи заявок 27 ноября 2008 г. до 16.00


Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 5 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь», печ-СВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 студзеня 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў, печы-СВЧ і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 лістапада 2008 года. Удачы ў гульні!**

Тэрмін правядзення гульні — з 04.11.08 па 14.01.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № ___ ад __.__.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________ **(аддзяленне сувязі)**

____________________ **на І кв. або 1–е паўг. 2009 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ **(індэкс)** ____________________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ________ (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Колькасць камплектаў ____

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ____________________ (адрас)

(паштовы індэкс) ________ (горад, населены пункт) ________

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету ________ (індэкс выдання)

ПВ | места | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ____________________ (адрас)

(паштовы індэкс) ________ (горад, населены пункт) ________

# Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ БЮДЖЭЦЕ НА 2009 ГОД

***(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 18, 19 лістапада.)***

пакрыццё бацькамі расходаў на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

пакрыццё арганізацыямі камунальных паслуг, расходаў на эксплуатацыю, капітальны і бягучы рамонт будынкаў, збудаванняў і памяшканняў, якім перадаюцца ў бязвыплатнае карыстанне будынкі, збудаванні і памяшканні бюджэтных арганізацый;

аплату расходаў на ўтрыманне, эксплуатацыю, бягучы рамонт будынкаў, збудаванняў і памяшканняў, сувязь, камунальныя і іншыя паслугі арганізацыямі, якім здаюцца ў арэнду будынкі, збудаванні і памяшканні бюджэтных арганізацый;

пакрыццё ў адпаведнасці з заканадаўствам сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста, у выпадку, калі яны не адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін па размеркаванні;

аплату расходаў на аказанне дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь за мяжой консульскіх паслуг;

аплату расходаў на ажыццяўленне дзяржаўнага будаўнічага нагляду за аб'ектамі будаўніцтва;

аплату расходаў на размеркаванне органамі дзяржаўнай статыстыкі зводных статыстычных даных, аказанне іншых інфармацыйных паслуг;

пакрыццё ў адпаведнасці з заканадаўствам расходаў мытных органаў;

пакрыццё асуджанымі расходаў на іх утрыманне ў крымінальна-папраўчых установах;

пакрыццё расходаў за пражыванне ў пакоях працяглых спатканняў;

карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі навучэнцамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, і вучэбнымі дапаможнікамі выхаванцамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі. Плата за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі навучэнцамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, і вучэбнымі дапаможнікамі выхаванцамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі, устанаўліваецца ў залежнасці ад матэрыяльнага становішча сем'яў, тыпу ўстановы і ўзроўню навучання;

пакрыццё расходаў на вызначэнне кошту маёмасці;

пакрыццё расходаў, звязаных з арганізацыяй (падрыхтоўкай) і правядзеннем аўкцыёнаў і конкурсаў па продажы маёмасці, адводам і дзяржаўнай рэгістрацыяй стварэння зямельных участкаў;

пакрыццё расходаў за аказанне паслуг медыцынскімі выцвярэзнікамі;

страхавыя кампенсацыі ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам;

аплату кошту сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

пакрыццё ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам, расходаў за афармленыя і выдадзеныя медыцынскія кніжкі, за выдадзеныя дыпломы і дублікаты пасведчанняў, атэстатаў і дыпломаў аб адукацыі, якія выраблены за кошт бюджэтных сродкаў;

пакрыццё ў адпаведнасці з заканадаўствам расходаў на харчаванне адміністрацыйна арыштаваных;

выкананне мерапрыемстваў па ахове раслін;

дзейнасць лабараторыі тэхналогій утылізацыі звычайных боепрыпасаў і даследавання ўласцівасцяў выбуховых матэрыялаў;

3.2. сродкі, якія атрымліваюцца падраздзяленнямі органаў унутраных спраў (за выключэннем Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь), унутранымі войскамі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад выробленай прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) штатнай кольквасцю, якая ўтрымліваецца за кошт бюджэтных сродкаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі;

3.3. сродкі, якія атрымліваюцца за харчаванне дзяцей ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі і фінансуюцца за кошт сродкаў адпаведных бюджэтаў.

4. Сума пеняў выплачваецца дадаткова да належнай да выплаты ў рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты сумы сродкаў у адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула.

5. Сродкі, якія атрымліваюцца і накіроўваюцца ў даходы рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з пунктамі 1, 3 і 4 гэтага артыкула, не абкладаюцца падаткамі, зборамі (пошлінамі).

6. Сродкі, якія атрымліваюцца дзяржаўнымі натарыяльнымі канторамі ад аказання дадатковых платных паслуг прававога і тэхнічнага характару, звязаных са здзяйсненнем натарыяльных дзеянняў, паступаюць на бягучыя рахункі па пазабюджэтных сродках і пасля падаткаабкладання застаюцца ў іх распараджэнні і выкарыстоўваюцца ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

7. Сродкі, указаныя ў пункце 3 гэтага артыкула, выплачваюцца ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

8. Сродкі, якія атрымліваюцца ўваходзячымі ў склад (сістэму) дзяржаўных органаў, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі арганізацыямі (вайсковымі часцямі), органамі і падраздзяленнямі, якія фінансуюцца з бюджэту, ад ажыццяўлення прыносячай даходы дзейнасці, якая рэалізуецца згодна з заканадаўствам і ўстаноўчымі дакументамі (у тым ліку сродкі, якія атрымліваюцца ад здачы другасных рэсурсаў і каштоўных металаў), за выключэннем сродкаў, якія атрымліваюцца ў адпаведнасці з пунктамі 3, 4 і 6 гэтага артыкула, паступаюць на бягучыя рахункі па пазабюджэтных сродках і пасля падаткаабкладання застаюцца ў іх распараджэнні і выкарыстоўваюцца на бягучае ўтрыманне, стварэнне і ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы ў парадку, устаноўленым Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Віды дзейнасці, указаныя ў частцы першай гэтага пункта, устанаўліваюцца дзяржаўнымі органамі, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь, а таксама з іншымі дзяржаўнымі органамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

9. Кантроль за своечасовым і поўным пералічэннем у бюджэт сродкаў у адпаведнасці з пунктамі 3 і 4 гэтага артыкула ажыццяўляецца ўваходзячымі ў склад (сістэму) дзяржаўных органаў, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі арганізацыямі (вайсковымі часцямі), органамі і падраздзяленнямі, якія атрымліваюць гэтыя сродкі.

**Артыкул 28.** Устанавіць, што ў 2009 годзе ваеннаслужачым (за выключэннем ваеннаслужачых тэрміновай службы), асобам начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь грашовая кампенсацыя ўзамен харчовага пайка ажыццяўляецца ў памеры 58 500 рублёў у месяц.

**Артыкул 29.** Устанавіць, што ў 2009 годзе:

1. Адкрыццё і абслугоўванне Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і іншымі банкамі рахункаў дзяржаўных органаў і бюджэтных арганізацый, іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў па адкрытых імі рахунках для размяшчэння бюджэтных сродкаў, а таксама выкананне аперацый са сродкамі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, выкананне плацежных інструкцый на пералічэнне падаткаў, збораў (пошлін), пені і іншых абавязковых плацяжоў у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя і пазабюджэтныя фонды ажыццяўляюцца без збірання ўзнагароды (платы).

За карыстанне грашовымі сродкамі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, якія знаходзяцца і размяшчаюцца на рахунках у банках, у тым ліку ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, банкі выплачваюць у даход адпаведнага бюджэту працэнты па стаўцы, устаноўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Залічэнне на бягучыя (разліковыя) рахункі, карт-рахункі, уклады (дэпазіты) і выплата з гэтых рахункаў заработнай платы, пенсій, дапамог, стыпендый і іншых грашовых выплат, якія праводзяцца грамадзянам у адпаведнасці з заканадаўствам за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляюцца банкамі без збірання ўзнагароды (платы).

3. Абслугоўванне знешніх дзяржаўных пазык, што пагашаюцца за кошт бюджэтных сродкаў, ажыццяўляецца банкамі, упаўнаважанымі Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь абслугоўваць знешнія дзяржаўныя пазыкі (крэдыты), з выплатай узнагароды ў памеры не больш як 0,02 працэнта ад сумы кожнага плацяжу за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на абслугоўванне знешняга дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 30.** Устанавіць, што ў 2009 годзе:

1. Нарматыўныя прававыя акты, прынятыя (выдадзеныя) да 2009 года, аб выдзяленні сродкаў або аб устанаўленні парадку фінансавання ў 2009 годзе забяспечваюцца фінансаваннем з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у межах сродкаў, прадугледжаных у расходах адпаведных бюджэтаў.

2. Нарматыўныя прававыя акты, якія цягнуць павелічэнне або змяншэнне аб'ёму даходаў, расходаў і (або) гранічнага памеру дэфіцыту, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на 2009 год, прымаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь альбо з яго згоды.

3. Урад Рэспублікі Беларусь пры неабходнасці ва ўстаноўленым парадку мае права ўносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб удакладненні асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на 2009 год не больш чым адзін раз у квартал, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 31.** Устанавіць, што ў 2009 годзе:

1. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць прымацца рашэнні:

1.1. у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, аб пакрыцці юрыдычным асобам (пазычальнікам) часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскім крэдытам у памерах расходаў на ўказаныя мэты, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на іншыя пытанні ў галіне прамысловасці, будаўніцтва і архітэктуры, паліва і энергетыку, развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рыбаводства і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, іншыя агульнадзяржаўныя расходы, іншую дзейнасць у галіне нацыянальнай эканомікі, а таксама за кошт сродкаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, што ўтвараюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.2. аб выдзяленні з рэспубліканскага бюджэту сродкаў, прадугледжаных на фінансаванне расходаў, звязаных са стыхійнымі бедствамі, аварыямі і катастрофамі;

1.3. аб накіраванні на аплату ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку камандзіровачных расходаў за межы Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных па відзе расходаў «Міжнародныя культурныя і інфармацыйныя сувязі» ў суме 700 000 тыс. рублёў звыш сродкаў, запланаваных на гэтыя мэты па ведамаснай класіфікацыі расходаў.

2. Фінансаванне расходаў па ацэнцы кошту маёмасці ажыццяўляецца за кошт сродкаў:

рэспубліканскага бюджэту ў парадку, што вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, — якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці;

адпаведных мясцовых бюджэтаў у парадку, што вызначаецца абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі, — якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці.

3. Грамадскім аб'яднанням можа аказвацца па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўная падтрымка з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

4. Юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам можа аказвацца з рэспубліканскага бюджэту фінансавая дапамога за кошт сродкаў, прадугледжаных на гэтыя мэты, у парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

5. Гранічныя памеры складаюць:

5.1. абавязацельстваў па дагаворах страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы — у эквіваленце 311 млн долараў ЗША;

5.2. сродкаў (без уліку сродкаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў у адпаведнасці з часткай другой гэтага падпункта), якія накіроўваюцца на:

кампенсацыю юрыдычным асобам часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, — 438 млрд рублёў;

аказанне фінансавай дапамогі юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, — 110 млрд рублёў.

Гранічныя памеры сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі, рэспубліканскага дарожнага фонду, рэспубліканскага фонду аховы прыроды, фонду арганізацыі збору (нарыхтоўкі) і выкарыстання адходаў у якасці другаснай сыравіны, фонду ўніверсальнага абслугоўвання (рэзерву ўніверсальнага абслугоўвання), якія накіроўваюцца на аказанне фінансавай дапамогі юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, кампенсацыю юрыдычным асобам часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, прадастаўленне бюджэтных пазык, устанаўліваюцца ў заканадаўчых актах пры вызначэнні на 2009 год напрамкаў і памераў выкарыстання гэтых фондаў.

Гранічныя памеры сродкаў інавацыйных фондаў, што ўтвараюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, якія падпарадкаваны Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, і накіроўваюцца на пакрыццё працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, прадастаўленне бюджэтных пазык, устанаўліваюцца ўказанымі органамі і арганізацыямі, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, а таксама Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў пры зацвярджэнні расходаў інавацыйных фондаў па напрамках і мэтах выкарыстання ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 32.** Устанавіць, што ў 2009 годзе Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь у працэсе выканання рэспубліканскага бюджэту мае права:

1. Уносіць змяненні ў:

квартальнае размеркаванне даходаў рэспубліканскага бюджэту;

даходы рэспубліканскага бюджэту ў межах зацверджаных гадавых паступленняў;

квартальнае размеркаванне расходаў рэспубліканскага бюджэту;

расходы рэспубліканскага бюджэту па ведамаснай і эканамічнай класіфікацыі расходаў бюджэту ў межах зацверджаных гадавых назначэнняў па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

расходы рэспубліканскага бюджэту па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту ў частцы асігнаванняў на фінансаванне дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы і рэзервовых фондаў;

памеры крыніц фінансавання дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту;

даходы рэспубліканскага бюджэту ў частцы мытных пошлін (вывазных) на нафтапрадукты і расходы рэспубліканскага бюджэту ў частцы субсідый на пакрыццё кошту імпартуемай вуглевадароднай сыравіны.

2. У выпадку незаконнага атрымання або выкарыстання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі не па мэтавым прызначэнні альбо з парушэннем заканадаўства сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту, альбо існуючай запазычанасці па плацяжах у гэты бюджэт, уключаючы запазычанасць па бюджэтных пазыках, бюджэтных крэдытах, невыканання рашэнняў Урада Рэспублікі Беларусь, прынятых у межах яго кампетэнцыі, ажыццяўляць пагашэнне (пакрыццё) такой запазычанасці за кошт сродкаў, якія перадаюцца з рэспубліканскага бюджэту ў бюджэты абласцей і г. Мінска.

3. Ажыццяўляць залік падлягаючых выплаце ў рэспубліканскі бюджэт юрыдычнымі асобамі падаткаў, збораў (пошлін) і іншых абавязковых плацяжоў, запазычанасці па бюджэтных пазыках, нявыкананых абавязацельствах па пазыках, выдадзеных з фонду падтрымкі экспарту, выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь па знешніх дзяржаўных пазыках (крэдытах) і крэдытах, выдадзеных банкамі юрыдычным асобам, а таксама налічаных пені, працэнтаў і штрафаў — у межах сродкаў, якія належаць указаным юрыдычным асобам з рэспубліканскага бюджэту, у тым ліку сродкаў адпаведных інавацыйных фондаў.

**Артыкул 33.** У 2009 годзе пералік будоўляў і аб'ектаў (за выключэннем аб'ектаў будаўніцтва (рэканструкцыі) дадатковай інфраструктуры аграгарадкоў), што фінансуюцца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а таксама за кошт рэспубліканскага фонду аховы прыроды, рэспубліканскага дарожнага фонду і дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь вызначаецца ў дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме на 2009 год, якая зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 34.** У 2009 годзе:

1. Утвараць інавацыйныя фонды за кошт адлічэнняў у памеры не больш за 0,25 працэнта, за выключэннем адлічэнняў у адпаведнасці з часткай першай падпункта 2.1 пункта 2 гэтага артыкула:

1.1. рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання (за выключэннем Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь), іншым дзяржаўным арганізацыям, падначаленым Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, абласным і Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні (распараджэнні), арганізацый (за выключэннем арганізацый, указаных у частцы другой гэтага падпункта), гаспадарчых таварыстваў, што не ўваходзяць у склад падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь арганізацый, але акцыі (долі ў статутных фондах) якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, прапарцыянальна долі дзяржаўнай уласнасці, акрамя часткі інавацыйнага фонду Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, што ўтвараецца і выкарыстоўваецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2006 г. № 499 «Аб некаторых мерах па абнаўленні асноўных сродкаў у будаўнічай галіне» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 127, 1/7828).

Бюджэтныя арганізацыі, арганізацыі ў частцы вытворчасці прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, у тым ліку за кошт сродкаў аказанай дзяржаўнай падтрымкі, а таксама арганізацыі па аказваемых насельніцтву і субсідзіруемых з бюджэту жыллёва-камунальных паслугах, паслугах па перавозцы пасажыраў транспартам агульнага карыстання ў гарадскім пасажырскім, прыгарадным аўтамабільным унутраным водным транспарце не ажыццяўляюць адлічэнні ў інавацыйныя фонды;

1.2. Міністэрству гандлю Рэспублікі Беларусь — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг):

арганізацый, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні (распараджэнні) Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь, у тым ліку гаспадарчых таварыстваў, у дачыненні да якіх Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь упаўнаважана кіраваць акцыямі (долямі ў статутных фондах), якія належаць дзяржаве;

арганізацый, якія ажыццяўляюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аптовы і рознічны гандаль таварамі (за выключэннем тавараў, пералік якіх вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь), а таксама дзейнасць у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва і грамадскага харчавання, незалежна ад формаў уласнасці (за выключэннем арганізацый (акрамя гаспадарчых таварыстваў), якія адлічваюць сродкі ў інавацыйныя фонды, што ўтвараюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падначаленымі Ураду Рэспублікі Беларусь, Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку»);

гаспадарчых таварыстваў, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні (распараджэнні) рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама якія ўваходзяць у склад іншых дзяржаўных арганізацый, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь, акцыі (долі ў статутным фондзе) якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, і ажыццяўляюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аптовы і рознічны гандаль таварамі, за выключэннем тавараў, пералік якіх вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама дзейнасць у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва і грамадскага харчавання, прапарцыянальна акцыям (долям у статутных фондах), якія не належаць дзяржаве.

Арганізацыі (гаспадарчыя таварыствы), указаныя ў абзацах другім — чацвёртым часткі першай гэтага падпункта, адлічваюць сродкі ў інавацыйны фонд Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь у памерах і парадку, устаноўленых гэтым Міністэрствам, а гаспадарчыя таварыствы, указаныя ў абзацы чацвёртым часткі першай гэтага падпункта, — і ў інавацыйныя фонды, створаныя названымі органамі і арганізацыямі, у памерах і парадку, устаноўленых заканадаўствам.

Адлічэнні ў інавацыйны фонд Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь праводзяцца ад сабекошту рэалізаваных прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), які фарміруецца ва ўстаноўленым парадку арганізацыямі, што ажыццяўляюць аптовы і рознічны гандаль і дзейнасць у сферы грамадскага харчавання, без уліку пакупнога кошту рэалізуемых тавараў, а арганізацыямі, што ажыццяўляюць дзейнасць у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва, — без уліку кошту матэрыялаў, якія аплачваюцца насельніцтвам;

1.3. Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), якія знаходзяцца ў яго падпарадкаванні (распараджэнні) арганізацый, у тым ліку бюджэтных арганізацый у частцы ажыццяўлення імі дзейнасці, якая прыносіць даходы, у адпаведнасці з заканадаўствам;

1.4. Беларускаму рэспубліканскаму саюзу спажывецкіх таварыстваў — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) арганізацый спажывецкай кааперацыі;

1.5. Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) юрыдычных асобаў, якія ўтвараюцца гэтай Федэрацыяй;

1.6. грамадскім аб'яднанням «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) арганізацый, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца гэтыя грамадскія арганізацыі.

2. Устанавіць:

2.1. павышаныя памеры адлічэнняў у інавацыйныя фонды рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, грамадскіх аб'яднанняў «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» згодна з дадаткам 12.

Абласным і Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам устанаўліваць зыходзячы са спецыфікі работы павышаныя памеры адлічэнняў у інавацыйныя фонды для арганізацый, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні (распараджэнні), а таксама гаспадарчых таварыстваў, якія маюць акцыі (долі ў статутных фондах) у камунальнай уласнасці, прапарцыянальна долі камунальнай уласнасці;

2.2. нарматывы накіравання сродкаў інавацыйных фондаў на фінансаванне навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх і доследна-тэхналагічных работ, работ па падрыхтоўцы і засваенні вытворчасці новых відаў навукаёмістай прадукцыі, а таксама галіновых праграм энергазберажэння і мерапрыемстваў па ўкараненні новых энергаэфектыўных тэхналогій і абсталявання згодна з дадаткам 13.

3. Устанавіць, што:

3.1. адлічэнні ў інавацыйныя фонды адносяцца на сабекошт і ўключаюцца ў затраты па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

3.2. парадак фарміравання і выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

3.3. Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь сродкі інавацыйнага фонду могуць накіроўвацца арганізацыям гандлю і бытавога абслугоўвання, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, у адпаведнасці з накірункамі і мэтамі выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў, а таксама на фінансаванне расходаў па ўтрыманні апарату кіравання дзяржаўнага аб'яднання «Белбыт»;

3.4. частка павышанага нарматыву інавацыйных фондаў, якія ўтвараюцца:

Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам энергетыкі Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь, накіроўваецца на фінансаванне расходаў па ўтрыманні цэнтральных апаратаў гэтых міністэрстваў і Камітэта;

Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, накіроўваецца на абнаўленне асноўных сродкаў арганізацый, што знаходзяцца ў падпарадкаванні (распараджэнні) абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, гаспадарчых таварыстваў, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, што ажыццяўляюць дзейнасць у сферы будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў у мэтах забеспячэння развіцця вытворчай базы ўказаных арганізацый;

3.5. вяртанне страт даходаў бюджэту пры ўстаноўцы грамадзянам тэлефонаў на льготных умовах у адпаведнасці з заканадаўствам ажыццяўляецца за кошт сродкаў інавацыйнага фонду Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь;

3.6. парадак, тэрміны аплаты і залічэнні, накіраванні і мэты выкарыстання сродкаў інавацыйнага фонду, які ўтвараецца Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, вызначаюцца Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

3.7. парадак, тэрміны аплаты і залічэнні, накіраванні і мэты выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў, што ўтвараюцца грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

3.8. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падначаленыя Ураду Рэспублікі Беларусі, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Беларускі рэспубліканскі саюз спажывецкіх таварыстваў у двухтыднёвы тэрмін з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона ўстанаўліваюць для арганізацый, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні (распараджэнні), а таксама гаспадарчых таварыстваў, што не ўваходзяць у склад падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь арганізацый, але акцыі (долі ў статутных фондах) якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, памеры адлічэнняў у інавацыйныя фонды.

4. Сродкі інавацыйных фондаў, незаконна атрыманыя або выкарыстаныя не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем заканадаўства рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падначаленымі Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі, якія фарміруюць такія фонды, а таксама арганізацыямі — атрымальнікамі сродкаў з указаных фондаў, падлягаюць вяртанню ў бясспрэчным парадку ў адпаведны фонд па рашэнні фінансавых і іншых органаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

5. Зацвердзіць на 2009 год даходы інавацыйных фондаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, якія ўключаюцца ў рэспубліканскі бюджэт, у суме 2 689 432 779 тыс. рублёў і расходы інавацыйных фондаў у суме 3 222 042 888 тыс. рублёў (без уліку сродкаў, якія накіроўваюцца на прадастаўленне субвенцый абласцям для стварэння дадатковай і развіцця дзейнай сацыяльнай інфраструктуры аграгарадкоў у суме 196 910 880 тыс. рублёў і Беларускаму інавацыйнаму фонду ў суме 46 227 610 тыс. рублёў, а таксама з улікам накіравання сродкаў рэспубліканскага бюджэту) згодна з дадаткам 13.

**Артыкул 35.** Устанавіць, што ў 2009 годзе:

плата за лясныя карыстанні, вылічаная па тэрмінах аплаты ў 2009 годзе, паступленні ад продажу драўніны, нарыхтаванай пры правядзенні высечак прамежкавага карыстання і іншых высечак, ад пабочнага лесакарыстання і вядзення паляўнічай гаспадаркі, а таксама сумы пені, што плацяцца лесакарыстальнікамі за прадастаўленне юрыдычнай асобай, якая распараджаецца лясной гаспадаркай, або тэрытарыяльным органам Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь адтэрміноўкі на нарыхтоўку і вываз драўніны, не высечанай і не вывезенай ва ўстаноўлены тэрмін, застаюцца ў распараджэнні арганізацый лясной гаспадаркі, не абкладаюцца падаткамі, зборамі (пошлінамі) і накіроўваюцца на фінансаванне мерапрыемстваў па вядзенні лясной і паляўнічай гаспадаркі;

стаўкі зямельнага падатку індэксуюцца на 87 працэнтаў;

сумы падатку за выкарыстанне прыродных рэсурсаў (экалагічнага падатку), за выключэннем плацяжоў за перапрацоўку нафты і нафтапрадуктаў арганізацыямі, якія ажыццяўляюць перапрацоўку нафты, індэксуюцца на 17 працэнтаў;

памер валавой выручкі, устаноўленай заканадаўствам у якасці крытэрыю для прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, індэксуецца на 17 працэнтаў.

**Артыкул 36.** Устанавіць, што ў 2009 годзе мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права:

павялічваць (памяншаць), але не больш чым у два разы стаўкі зямельнага падатку, падатку на нерухомасць асобным катэгорыям плацельшчыкаў. Рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб павелічэнні ставак указаных падаткаў не распаўсюджваюцца на юрыдычныя асобы і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія атрымліваюць дзяржаўную падтрымку ў выглядзе змянення ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну выплаты падаткаў, збораў, мытных плацяжоў і пені, субсідый і сродкаў на фінансаванне капітальных укладанняў з рэспубліканскага бюджэту;

прадастаўляць асобным плацельшчыкам — фізічным асобам, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ільготы па выплаце зямельнага падатку, падатку на нерухомасць, падаходнага падатку з фізічных асобаў, адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асобаў;

вызваляць ад выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомасць арганізацыі спажывецкай кааперацыі па аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання, размешчаных у сельскай мясцовасці.

**Артыкул 37.** Устанавіць, што ў 2009 годзе:

1. Плацельшчыкі адлічэнняў у дзяржаўны мэтавы бюджэтны фонд нацыянальнага развіцця, інавацыйныя фонды, вызначаныя адпаведна ў артыкулах 20 і 34 гэтага Закона, а таксама часткі прыбытку рэспубліканскіх і камунальных унітарных прадпрыемстваў, часткі даходаў гаспадарчых таварыстваў нясуць адказнасць за нявыплату, няпоўную выплату ўказаных адлічэнняў і плацяжоў, устаноўленую заканадаўствам для плацельшчыкаў падаткаў, збораў (пошлін).

Падатковыя органы пры правядзенні праверак фінансава-гаспадарчай дзейнасці ажыццяўляюць кантроль за выплатай указаных у гэтым пункце адлічэнняў і плацяжоў, спаганяюць іх у бясспрэчным парадку ў выпадку іх нявыплаты, няпоўнай выплаты.

2. Плацельшчыкі арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, арэндадавальнікамі якіх з'яўляюцца сельскія, пасялковыя, гарадскія, раённыя выканаўчыя і распарадчыя органы, карыстаюцца правамі і выконваюць абавязкі, устаноўленыя для плацельшчыкаў падаткаў, збораў (пошлін).

Падатковыя органы пры ажыццяўленні кантролю за правільным вылічэннем, поўнай і своечасовай выплатай арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, арэндадавальнікамі якіх з'яўляюцца сельскія, пасялковыя, гарадскія, раённыя выканаўчыя і распарадчыя органы, прымяненні спосабаў забеспячэння яе выплаты, а таксама выплаты пені, спагнанні гэтай платы і пені карыстаюцца правамі і выконваюць абавязкі, устаноўленыя для ажыццяўлення падатковага кантролю, прымянення спосабаў забеспячэння выканання падатковых абавязацельстваў, спагнання падаткаў, збораў (пошлін) і пені.

Нявыплата або няпоўная выплата арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, арэндававальнікамі якіх з'яўляюцца сельскія, пасялковыя, гарадскія, раённыя выканаўчыя і распарадчыя органы, парушэнне ўстаноўленага тэрміну прадстаўлення падатковых дэкларацый (разлікаў) па гэтай плаце цягнуць за сабой адказнасць, устаноўленую заканадаўствам за нявыплату, няпоўную выплату падаткаў, збораў (пошлін), парушэнне ўстаноўленага тэрміну прадстаўлення ў падатковы орган падатковай дэкларацыі (разліку).

**Артыкул 38.** Устанавіць у 2009 годзе наступную чарговасць уключэння ў адпускныя цэны (тарыфы) на прадукцыю, тавары (работы, паслугі) сумаў падаткаў і збораў, якія плацяцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі з выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў (работ, паслуг):

акцызы (для падакцызных тавараў);

збор у рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі;

падатак на дабаўленую вартасць.

**Артыкул 39.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона прыняць меры, неабходныя для яго выканання.

Абласным і Мінскаму гарадскому Саветам дэпутатаў забяспечыць своечасовае зацвярджэнне адпаведных мясцовых бюджэтаў і ў трохмесячны тэрмін з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона прыняць іншыя меры, неабходныя для яго выканання.

**Артыкул 40.** Устанавіць, што ў 2009 годзе Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Беларусь прымяняецца да адносінаў, урэгуляваных гэтым Законам, у частцы, якая не супярэчыць гэтаму Закону.

**Артыкул 41.** Гэты Закон уступае ў сілу з 1 студзеня 2009 года, за выключэннем гэтага артыкула, падпункта 3.8 пункта 3 артыкула 34 і артыкула 39, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*13 лістапада 2008 года, г. Мінск.*
*№ 450 — З*

# Апостал Пётр і камета Галея

**З 17 па 21 лістапада ў Мінску праходзяць V Свята-Міхайлаўскія Чытанні «Праваслаўе і сучаснасць». Гэта традыцыйная сустрэча свецкай адукацыі, навукі і багаслоўя напярэдадні праваслаўнага свята Сабора Архістратыга Міхаіла і іншых Нябесных Сілаў бясплотных (21 лістапада), якую ладзіць Свята-Міхайлаўскае брацтва Мінскай епархіі па блаславенні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта і пры падтрымцы Міністэрстваў адукацыі, культуры, інфармацыі, НАН Беларусі, Апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкама і ВНУ сталіцы.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Падарунак Чытанням — паднос з выявай Залатога Кола Расіі — уручае архіепіскапу Полацкаму і Глыбоцкаму ФЕАДОСІЮ саветнік Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Ягор АНДРЭЕЎ.**

Як заўважыў архіепіскап Полацкі і Глыбоцкі ФЕАДОСІЙ, тэма Чытанняў заўсёды актуальная, гэта закладзена ўжо ў самой назве форуму. Невыпадкова, напэўна, і цяпер, калі сусветнае грамадства напружана сочыць за станам глабальнай фінансавай сістэмы, Пленарнае пасяджэнне Чытанняў адкрыў дырэктар Інстытута эканомікі НАН Беларусі Пётр НІКІЦЕНКА. Паводле яго меркавання, любая эканамічная мадэль асуджана на крах, калі не будзе абапірацца на духоўна-маральны гаспадарчы механізм. Распрацоўка такога механізма магчымая ў сумеснай рабоце царквы і навуковых інстытутаў, і ў Беларусі ўжо ёсць спробы такой работы.

— Праваслаўе — гэта не проста адзін з самых старажытных інстытутаў чалавецтва, гэта жывая культура, патэнцыял якой запатрабаваны сучасным чалавекам, — упэўнены вучоны.

— Чытанні імкнуцца ахапіць усе праблемы сучаснага грамадства ў рэчышчы духоўнага жыцця, — сказаў архіепіскап Феадосій. — Мы не можам абысці і палітыку, праблемы глабалізму. Адзін з палітолагаў сказаў, што ў аснову свайго выжывання Расія павінна пакласці зямныя нетры, Украіна валодае залатым запасам — зямлёй, а Беларусь павінна мець высокі інтэлектуальны патэнцыял сваіх грамадзян. Аднак без духоўнага складніка інтэлект — гэта двухбаковавострая зброя, якая можа быць накіравана супраць свайго народа.

Гэта можа адбыцца ў выніку так званай «уцечкі мазгоў», і менавіта Праваслаўная царква, упэўнены ўладыка, здольная станоўча паўплываць на гэты працэс, бо ніводны інстытут не можа ў такой ступені выхоўваць патрыётаў, як яна.

Звяртаючыся да пытання ўзаемадзеяння навукі і рэлігіі, архіепіскап Феадосій узгадаў падзею, якая адбылася не так даўно, калі ўвесь свет сачыў за рухам каметы Галея. Для вучоных гэта нябеснае цела мела асаблівы інтарэс, бо яго ядро ўтрымлівала рэчыва, з якога ўзнікла матэрыя. Наколькі ж вялікім было іх здзіўленне, калі рэнтгенаўскія здымкі ядра паказалі, што гэта рэчыва — лёд, вада. Аднак апостал Пётр ведаў пра гэта яшчэ 2 тысячы гадоў таму, у сваім пасланні ён казаў, што спачатку Словам Божым нябёсы і зямля былі ўтвораны з вады і вадою... Такім чынам ні багасловы, ні многія вучоныя не бачаць ніякіх супярэчнасцяў паміж верай і навукай. Больш за тое, гісторыя чалавецтва паказвае, што каб не парушыць гармонію сусвету, неабходна спалучэнне аднаго з другім.

У Чытаннях бяруць удзел 46 прадстаўнікоў духавенства, навукі, адукацыі, у тым ліку 12 — з Расіі і 34 — з Беларусі. Удзельнікі з Расіі правядуць каля 50 гутарак-лекцый у ВНУ Мінска.

— Усе тэмы, заяўленыя ўдзельнікамі, можна падзяліць на тры асноўныя: аб'яднанне Расіі, Украіны і Беларусі, дэмаграфічная сітуацыя і праблемы адукацыі, выхавання і культуры, — назваў «болевыя кропкі», якія закранаюць V Свята-Міхайлаўскія Чытанні старшыня Праваслаўнага брацтва ў гонар Святога Архістратыга Міхаіла Алег Дзіхціеўскі. — І самае цікавае ў гэтых Чытаннях тое, што гэта не проста лекцыі, даклады, а перш за ўсё — гутаркі, магчымасць зносінаў, магчымасць задаць пытанне, якое хвалюе, і атрымаць на яго адказ.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*Открытое акционерное общество «Постторг»*

*г. Минск, ул. Клумова, 3*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

***Собрание состоится 9 декабря 2008 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Уральская, 3, РДК им. Н.Ф. Шарко.***

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Уменьшение Уставного фонда и аннулирование акций, выкупленных на баланс Общества.
2. Принятие Устава в новой редакции.

**С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Клумова, 3, комн. 21 с 1 по 9 декабря 2008 года с 15.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) либо 9 декабря 2008 года по месту проведения собрания.**

Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 декабря 2008 года.

УНП 100036531 **Наблюдательный совет**

*ОАО «Универсам Северный»*

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ, ЧТО 2 ДЕКАБРЯ 2008 ГОДА В 12.00 ПО АДРЕСУ: Г. МИНСК, УЛ. МИРОШНИЧЕНКО, 3 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О досрочном прекращении полномочий членов совета директоров ОАО «Универсам Северный».
2. Выбор членов совета директоров ОАО «Универсам Северный».
3. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизора общества.

Акционеры при себе должны иметь удостоверение личности.
Начало регистрации — 11.30.
Телефон для справок — 2 61 13 61.

**Совет директоров общества** УНН 100356386

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Новашино Петришковского сельсовета Минского района, в том числе: **Лот 2** – земельный участок площадью 0,1527 га, начальная цена – 10 380 000 рублей; **Лот 3** – земельный участок площадью 0,1546 га, начальная цена – 10 504 000 рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.06.2008 г. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

**У суд Лідскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Сарвары Джана АФГАНА**, 25 снежня 1966 года нараджэння, ураджэнца правінцыі Пакція, г. Хост Афганістана, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Магілёў, вул. Будаўнікоў, д. 7, кв. 15. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Сарвары Джана Афгана, паведаміць іх суду Лідскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлай **Мельнік Святланы Іванаўны** 26.02.1977 года нараджэння, ураджэнкі в. Куляшы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання — в. Куляшы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзянку Мельнік С.І., паведаміць іх суду Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ФАРМАТнём

# Ці ёсць жыццё пасля вяселля?..

**З 20 па 23 лістапада ў Мінску ў кінатэатрах «Аўрора», «Мір», «Перамога», «Цэнтральны» ў чарговы раз пройдзе эксклюзіўны паказ фільмаў праекта «КІНАфармат 4х4».**

**«Чорнае сонца»** — так называецца драма, створаная кінамайстрамі Італіі і Францыі. Пастаноўку карціны ажыццявіў класік еўрапейскага кіно рэжысёр Кшыштаф Занусі.



Агата — жанчына з вопытам, якая не страціла прыгажосць. Манфрэдзі — анёлападобны мужчына намнога маладзейшы за яе. Першыя хвілін пятнаццаць маладыя будуць не замаўкаючы балбатаць аб сваім каханні, а потым выпадковы стрэл снайпера пазбаўляе жыцця нашага шчаслівага мужычка, пакінуўшы няўцешнай удаве толькі надзею на помсту.

У фільме здымаліся Валерыя Галіно, Ларэнца Балдучы, Марка Басіле, Тоні Бертарэлі і інш.

Кінематаграфістамі Германіі, Францыі і Нарвегіі створана драматычная камедыя **«О'Хортан»**, з вялікім поспехам паказаная на міжнародных кінафестывалях у Канах, Карлавых Варах і Таронта.



Пажылы чыгуначнік Од Хортан выходзіць на пенсію, і раптам вакол яго пачынае адбывацца штосьці неверагоднае: то раптам сярод ночы ён ідзе скакаць на лыжах з трампліна, то выпадковы знаёмы прапануе яму пракаціцца па Осла на машыне з закрытымі вачыма. А аднойчы Хортану давялося правесці ноч пад ложкам маленькага хлопчыка...

Пастаноўку фільма па сваім сцэнарыі ажыццявіў рэжысёр Бент Хамер. У галоўных ролях занятыя Баард Ове, Гіта Нёрбі, Петэр Брэдал, Б'ёрн Флоберг, Пер Енсен.

Заслужаным поспехам на МКФ у Себасцьяне карысталася германа-аўстрыйская кінадрама **«Прачысціць мазгі!»**. Аўтары сцэнарыя — Катарына Хельд і Ханс Вайнгартнер, рэжысёр-пастаноўшчык — Ханс Вайнгартнер.

Цынічны тэлепрадзюсар Райнер — кароль ідыёцкіх ток-шоу, вульгарных тэлеконкурсаў і іншых поляў цудаў, падаўляе мукі сумлення, ганяючы на супертачцы і нюхаючы белы парашок. Але потым ён сустракаецца з рашуча настроенай маладой асобай, якая задумала адпомсціць яму за смерць свайго дзядулі, які стаў ахвярай адной з віктарын. Яны скалачваюць падпольную групу па працідзеянні тэлерэйтынгам.



У фільме здымаліся Морыц Бляйбтрой, Эльза Шульц Гамбарт, Мілан Пешэль, Сімоне Хансельман, Грэгар Блаэб.

Кінамайстрамі Францыі і Ірана знятая прыгодніцкая стужка **«Крык мурашоў»**. Яе паставіў па сваім сцэнарыі рэжысёр Мохсен Махмальбаф.

Жанчына, якая верыць у Бога, закаханая ў атэіста, але гэта не з'яўляецца для іх перашкодай, каб уступіць у шлюб. Згуляўшы вяселле, маладыя вырашаюць правесці свой мядовы месяц у Індыі. Вось тут і адбываюцца з імі неверагодныя прыгоды...



У ролях: Махмуд Чакрола-хі, Манур Шадзі, Карл Мас, Савітха Іер.

**Раман КОСЦІН.**

Алег АЛОЎНІКАЎ:

# «МСЦІСЛАЎ РАСТРАПОВІЧ — МОЙ НАСТАЎНІК»



Алег АЛОЎНІКАЎ.

**Я меркавала, што гэта проста прыгожая метафара выдатнага беларускага віяланчэліста Алега Алоўнікава. Ну, гавораць жа акцёры — я вучыўся ў Станіслаўскага; скульптары — я вучыўся ў Радэна; настаўнікі — я вучыўся ў Макаранкі...**

**Аднак не, колішні студэнт Маскоўскай кансерваторыі, юнак з Мінска Алег Алоўнікаў сапраўды быў вучнем слыннага музыканта.**

**А на сёння Алег Алоўнікаў — саліст Беларускай дзяржаўнай філармоніі, лаўрэат нацыянальных і міжнародных конкурсаў. Яго адрознівае выдатнае тэхнічнае майстэрства, артыстызм, неверагодная выканальніцкая эмацыянальнасць, натхнёнасць...**

*Мы праглядаем фотаздымкі. Яны самыя розныя. Канцэртныя, урачыстыя. Сяброўскія — з Мсціславам Растраповічам, з Андрэем Вазнясенскім, з музыкантамі, кампазітарамі... І зусім нечаканыя, як вось гэты — адухоўлены твар каля начнога вогнішча ў час ігры на віяланчэлі...*

## Ноч. Агонь. Віяланчэль

— Люблю Крым, — *прызнаецца Алег Глебавіч.* — Быў у многіх краінах, на многіх морах. Але менавіта Чорнае мне бліжэй за ўсё. Мабыць, і сапраўды, невыпадкова сцвярджаюць, што Чорнае мора «па салёнасці» супадае з чалавечай крывёю. Мора гэтае вельмі пяшчотнае, можна спаць каля яго акурат пад зоркамі. І гэта лепш, чым у гасцініцы!

***— Вы ехалі адпачываць з віяланчэллю?.. А дарэчы, колькі важыць інструмент?***

— З футлярам — 12 кг. Але я звычайна бяру без футляра, у палатнянай «фабрычцы». Каб зручна было насіць, не баяцца ўпасці дзенебудзь з гары або нават плаваць.

***— Гэта віяланчэль дарожная, так сказаць, «пляжная»?***

— Ну, вядома ж, у канцэртнай зале на гэтым інструменце іграць не буду. Хоць... аднойчы іграў канцэрт, так склаліся абставіны. Усё залежыць ад таго, як ты валодаеш інструментам, пра што хочаш сказаць з дапамогай музыкі.

...Знаёмыя папрасілі, каб пайграў для іх на ўзбярэжжы, пад начнымі зоркамі каля вогнішча.

***— Напэўна, гукі былі чароўнымі?***

— Я шмат дзе іграў: і ў шлюзах, і на дахах...

***— Маэстра з віяланчэллю — на даху?!.***

— Вы не ўяўляеце, якая гэта асалода! Якая прыгажосць — асабліва калі бачны гарызонт: лес, вада, прастора...

У Крыме іграў нават на гары — 350 метраў. Там пляцоўка была вельмі маленькая, 2—3 крокі. Зараз вось думаю: як мне ўдалося ўскараскацца туды з віяланчэллю?

***— Вы былі адзін?***

— Так. А мог бы трапіць у Кнігу Гінэса, калі б хто побач быў, здымаў! *(Смяецца.)* Але тады я пра гэта не думаў. Затое ў памяці засталося назаўсёды.

***— Для вас важна, каб побач былі слухачы, альбо атрымліваеце задавальненне ад самога «працэсу»?***

— Слухачы — нават калі і сам не ведаеш пра іх — ёсць заўсёды. Калісьці дырэктарам Белдзяржфілармоніі быў Ратабыльскі, я іграў у Астрашыцкім Гарадку, непадалёк ад яго дачы — і не ведаў, што ён слухае. Потым ён сказаў: «Лепшага канцэрта не чуў за ўсё жыццё». А мне проста хацелася іграць.

Памятаеце, як напісаў Шэкспір у адным з лепшых сваіх санетаў:

*Тот, у кого нет музыки в душе,*
*Кого не тронут сладкие созвучья,*
*Способен на грабёж,*
*измену, хитрость;*
*Темны, как ночь,*
*души его движенья...*

## Гумар Растраповіча

***— Вас бацькі адразу аддалі ў клас віяланчэлі, ніякіх сумненняў у выбары інструмента не было?***

— Так атрымалася, што мая цётачка, музыкант, як убачыла свайго пляменніка-немаўлятку ў калысцы, адразу сказала: будзе віяланчэлістам (маўляў, «пастаноўка рук» дзіцяці надта ўжо адметная). Таму ў музшколу пры кансерваторыі мяне адразу аддалі на віяланчэль. Вучыўся з цікавасцю, заўсёды вылучаўся стараннасцю.

***— Як у фільме «Пакроўскія вароты»: на балконе ігралі на віяланчэлі і з зайздрасцю назіралі за хлопчыкамі-равеснікамі, якія гулялі ў футбол?***

— Не, бацькі ніколі не прымушалі мяне. Хацеў гуляць у футбол — ганяў разам з усімі мяч...

Пасля школы паступіў у Маскоўскую кансерваторыю, да Растраповіча. Напачатку гэта было чыстае вучнёўства. А потым, пасля 3-гадовай службы ў арміі (тады менавіта такой была працягласць тэрміновай службы), з Мсціславам Леапольдавічам мы ўжо кантактавалі і больш, і бліжэй. Дарэчы, ён нічога не гаварыў, аднак адчувалася, што збіраецца з'ехаць з краіны... У той час я бываў у яго не толькі ў маскоўскай кватэры на вуліцы Агарова, але і на дачы. Дочкі Растраповіча і Вішнеўскай, Лена і Воля, былі яшчэ зусім маленькія, забаўляў іх... Яны абедзве сталі музыкантамі.

***— Цікава, а Растраповіч строгі быў як настаўнік? Чыста знешняе ўражанне — што гэта быў надзвычай мяккі чалавек...***

— Сказаць, што ён быў мяккі, нельга. А вось тое, што Мсціслаў Леапольдавіч — чалавек з вялікім пачуццём гумару, гэта праўда.

Ён, напрыклад, расказваў, як разам са знакамітым кампазітарам Бенджамінам Брытэнам ехалі на прыём да каралевы Англіі. На кожным прыпынку Растраповіч, выходзячы, рабіў рэверансы. Раз—другі—трэці... Брытэн глядзеў на яго з жахам: «Слава, не рабі гэтага — будзе палітычны скандал!». У адказ: «Добра, Беня (так яго называў), не буду — калі ты напішаш для мяне дзве сюіты». І Бенджамін Брытэн напісаў дзве сюіты для віяланчэлі — спецыяльна для Растраповіча.

***— Якая дасціпная знаходлівасць!***

— Альбо Растраповіч расказваў, як удзельнічаў у асваенні цалінных зямель.

***— І там быў таксама?***

— Яны паехалі ўтрох: Растраповіч, артыст Міхаіл Ульянаў і баяніст Юрый Казакоў.

***— Маленькая канцэртная брыгада?***

— Можна і так сказаць. Яны апускалі барты і выступалі з грузавіка на палявых станах. Калі выступаў Ульянаў — усе разумелі. Калі Казакоў іграў на баяне — таксама. Калі выйшаў Растраповіч і зайграў на віяланчэлі (Казакоў акампанаваў яму на баяне)... Лысая галава, рука невядома дзе бегае... Некаторыя ўпершыню бачылі віяланчэль і не разумелі, што робіць гэты чалавек. А Растраповіч не на жарт разыграўся, рукі амаль не відаць... І раптам адзін калгаснік забіраецца ў кузаў грузавіка з кабіны вадзіцеля, прыцэльваецца і — хоп за руку Мсціслава Леапольдавіча са словамі: «Спыніся, дай паслухаць музыку!» Таму што віяланчэль не ўспрымалася як музычны інструмент... Растраповіч расказваў пра гэта з такім гумарам!

Дарэчы, адзін раз я і сам іграў з баяністам канцэрт (праўда, не на палявым стане!) — гэта цудоўнае спалучэнне.

## Мудрасць і музыка

***— У канцы жыцця, калі Растраповіч ужо быў пажылым чалавекам, пасля аднаго з канцэртаў яго раскрытыкавалі ў досыць некарэктнай форме... Узрост музыканта мае значэнне?***

— Трэба ўлічваць асобу: што ўяўляе чалавек як мастацкая з'ява.

***— Ці ёсць у музыканта гранічны ўзрост, калі варта адмовіцца ад публічных выступленняў — каб вучань музшколы не гаварыў: «Я гэтак жа магу сыграць!»***

— Калісьці я вёў аркестр у школе пры кансерваторыі. Адзін хлопчык, самы маленькі, звяртаўся да мяне на «ты». Ён падрастаў — і зноў на «ты». Аднойчы, ужо юнаком, сустрэў мяне са сваім сябруком — і зноў «ты, ты»... Непрыемна, і не таму, што ў мяне капялюш упадзе з галавы... Адзін на адзін сказаў яму: «Больш на «ты» да мяне не звяртайся». У адказ пачуў: «Я буду іграць гэтак жа, як ты!» Цудоўна, калі сыграеш яшчэ лепш, але... Але ён увогуле кінуў музыку...

Добра іграць на віяланчэлі вельмі няпроста, гэтаму трэба прысвяціць жыццё. Так, узрост ёсць узрост, рука не тая, рэакцыя... І тым не менш!

Першы нумар для мяне — іспанскі віяланчэліст-віртуоз Пабла Казальс (1876—1973). Я слухаў адзін з апошніх яго канцэртаў, маэстра было ўжо больш як 90 гадоў. Казальс іграў каталонскую песню ва



З Мсціславам РАСТРАПОВІЧАМ.

ўласнай апрацоўцы *(напявае)*. Гукі ўжо дрыжэлі — але ён не згубіў сябе, людзі ў зале плакалі... А ў мяне ёсць запіс, дзе Казальс іграе ў 86 гадоў — бліскуча!

Узрост — паняцце адноснае. Не толькі ў дачыненні да фізічнага стану, «формы», але і — самой асобы.

## Пра тое, што сніцца

***— Алег Глебавіч, каб стаць сапраўдным музыкантам, акрамя таленту, трэба...***

— ...шмат вучыцца і шмат працаваць. Калі гаварыць асабіста пра мяне, лічыце: 11 гадоў — музычная школа, першая кансерваторыя — 5 гадоў, другая — 6, аспірантура — 3...

***— У вас два дыпломы?***

— Яшчэ ў маладосці сказаў сабе: калі не буду іграць на віяланчэлі, дык стану дырыжыраваць; калі не змагу дырыжыраваць — буду пісаць музыку. Я скончыў не толькі выканальніцкі факультэт як віяланчэліст, але і дырыжорскі факультэт — як оперна-сімфанічны дырыжор. Вучыўся і ў Маскве, і ў Мінску.

Быў час, калі іграў 40 праграм — на падрыхтоўку кожнай ішло 3—4 месяцы. Ведаў на памяць 20 канцэртаў, каля 30 санат, больш як 100 п'ес...

Працаваў і са школьнікамі, і з камерным аркестрам у Оперным тэатры.

Напісаў каля 80 твораў, асабліва дарагія для мяне — «Элегія», «Жорсткае танга»... А два «Настальгічныя танга» мне прысніліся.

***— Як знакамітая табліца — Мендзялееву? І насамрэч — музыка можа прысніцца?***

— Уявіце сабе!.. Прыснілася, нібыта я іграю на віяланчэлі на сцэне — а з залы ўзнімаецца чалавек 50 са скрыпкамі і працягваюць са мной іграць. Гэта была вельмі прыгожая музыка... Прачнуўся — вельмі мала мог запісаць. Але гэты сон паўтараўся некалькі разоў.

***— Мабыць, танга — ваш любімы танец?***

— Адзін з самых любімых.

***— А вы ўмееце танцаваць танга?***

— Калісьці займаўся бальнымі танцамі, нечаму навучыўся...

***— Музыкант-майстар, які ведае на памяць неверагодную колькасць твораў; якія, што называецца, забыўся больш, чым некаторыя ведаюць... Ці трэба штодня браць інструмент у рукі, каб не страціць «форму»?***

— Трэба займацца рэгулярна. Увогуле, калі б усе працавалі так, як сапраўдныя музыканты, усе людзі мастацтва, дык мы даўно жылі б ужо пры камунізме ці ў нейкім суперграмадстве.

Ведаеце, калі доўга не займацца... Нават фізічна гэта адчуеш. На пальцах ёсць мазалі ад струн — праз пэўны час без віяланчэлі яны стануць мяккімі, і ты не зможаш сыграць як мае быць: усё-такі патрабуюцца даволі вялікія фізічныя намаганні, нагрузка на пальцы высокая. А мазольчыкі неабходныя — гэта датычыцца ўсіх струннікаў.

## Метафара ад Шаляпіна

***— Вы ўзгадалі, як знакаміты Пабла Казальс іграў каталонскую песню. Віяланчэль — класічны канцэртны інструмент, а ці па сілах ёй беларуская народная песня?***

— Яшчэ як па сілах! Мне давадзілася іграць з дзіцячым ансамблем, які выконвае аўтэнтычны беларускі фальклор. Нас прымалі «на ўра» і ў Чарнігаве, і ў Кракаве...

На віяланчэлі я іграў самую розную музыку — з рэпертуару Фрэнка Сінатры, Эдзіт Піяф, Шарля Азнавура... Рабіў аранжыроўкі досыць складаных твораў «Бітлз». А як гучыць «Бэсамэ муча» на віяланчэлі!

У гэтага інструмента велізарны дыяпазон, усе галасы ёсць: бас, барытон, тэнар, меццасапрана, высокія галасы, дзіцячыя... Ніякі іншы музычны інструмент гэтага не мае. Невыпадкова Шаляпін вельмі любіў віяланчэль. Ён гаварыў: «Вось бы спяваць так, як гучыць віяланчэль!»

***— Якая прыгожая метафара!***

— А я мог бы дадаць: вось бы іграць на віяланчэлі так, як спяваў Шаляпін!

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81*

№ 35 (285)

## Нашы абаронцы — пакаёвыя расліны

Мабыць, немагчыма сёння ўявіць наш дом без кветак. Кавалачак прыроды ў доме ў выглядзе пакаёвага саду — наша выратаванне ў «каменных джунглях», і гэта не будзе перабольшаннем.

Расліны не толькі ўпрыгожваюць нашы кватэры і офісы, але і ажыўляюць атмасферу памяшкання. Перш за ўсё кветкавыя расліны паглынаюць вуглякіслы газ і ўзбагачаюць паветра неабходным для нашага дыхання кіслародам. На кухнях з газавымі плітамі вельмі добра трымаць **хларафітум** і **сцындапсус** — яны паглынаюць лішкі вуглякіслага газу.



Зімой у кватэрах вельмі сухое паветра, што не надта добра для раслін. Дык вось кветкі, якія растуць у кватэрах, значна ўвільгатняюць паветра, выпараючы вільгаць. Пры гэтым значна паляпшаецца мікраклімат: паветра ў памяшканнях асвяжаецца, увільгатняецца і араматызуецца. Гэта крыху дапамагае пазбегнуць стомленасці, змяншае сухасць і запаленне слізістых абалонак. Асабліва паспяхова аптымізуюць мікраклімат **дэкаратыўны бальзам**, **манстэра** і іншая віды раслін, якія маюць буйныя лісты.

Многія сінтэтычныя матэрыялы, якімі аздоблены нашы кватэры (мэбля, шпалеры, лінолеум, фарбы, мыйныя рэчывы), камп'ютары і прынтары выдзяляюць у паветра шкодныя для чалавека рэчывы. Спецыялісты, якія працуюць над праблемай ачысткі паветра, высветлілі, што шэраг пакаёвых раслін валодаюць здольнасцю актыўна выдаляць з атмасферы лятучыя злучэнні. Актыўна паглынаюць і нейтралізуюць фармальдэгід **алоэ, хрызантэма, хларафітум, драцэна, філадэндрон, эхмея паласатая**. Хларафітум увогуле можна назваць чэмпіёнам па ачыстцы паветра. Ад пары бензолу нас пазбавяць пакаёвыя ліяны — **плюшчы** і **сцындапсусы**. Такімі ж здольнасцямі да ачышчэння паветра валодаюць **драцэна**, **сансевіерыя** («шчупакоў хвост»).

Многія пакаёвыя расліны выдзяляюць фітанцыды — рэчывы, якія знішчаюць мікраарганізмы або стрымліваюць іх размнажэнне. Напрыклад, розныя віды пакаёвых **пеларгоній (занальная, духмяная, буйнакветкавая, плюшчаліставая)** прадуцыруюць эфірныя алеі і фітанцыды, якія забіваюць стафілакокі і стрэптакокі, што выклікаюць у людзей мноства захворванняў. Эфірны алей пеларгоній валодае здольнасцю супакойваць нервовую сістэму чалавека, змякчаць стрэсы і праганяць бяссонніцу. Такія расліны добра трымаць у спальні, гасцёўні і дзіцячым пакоі. Народны сродак ад болю ў вушах: пакласці ў хворае вуха ліст пеларгоніі духмянай. Летам гэту расліну можна трымаць у садзе і на балконе.

Фітанцыдныя ўласцівасці маюць таксама **фікусы**, **стракаталісцёвыя дыфенбахіі**. Здольнасцю знішчаць бактэрыі і вірусы валодае **лаўр высакародны**. Яго карысна трымаць тым, хто пакутуе ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, спазмаў кішэчніка.

Эфектыўна падаўляюць хваробатворныя мікробы **акаліфа, аукуба, гібіскус, ісоп, мірт, плюшч**. Нават флегматычныя **кактусы**, асабліва з доўгімі іголкамі, не толькі ўпрыгожваюць дом, але і актыўна засцерагаюць нас ад мікробаў і электрамагнітнага выпраменьвання, таму іх і трымаюць паблізу крыніц выпраменьвання.

Класічныя фітанцыдцыя расліны — **хвойныя**. У гаршчочках, практычна, можна вырошчваць любыя хвойныя расліны, асабліва ў мініяцюрных садовых формах: **туі, кіпарысы, елкі**. Ім спатрэбіцца светлае месца, вільготнае паветра (паддон з увільготненым керамзітам, пяском). У кватэры жывая «ёлачка» да Новага года, а летам на балконе — лясны куток.

## І ўгнаенне, і раскісляльнік

Попел — угнаенне, даступнае для ўсіх агароднікаў. У ім змяшчаецца да 30 патрэбных раслінам элементаў: калій, кальцый, магній, жалеза, фосфар, сера, бор, марганец і інш. Попел можна ўносіць у любую глебу, за выключэннем тых, якія маюць шчолачную рэакцыю. Найбольшую карысць попел прыносіць на падзолістых і цяжкіх глебах. Выкарыстанне драўніннага попелу (4—7 кг на 10 квадратных метраў) на глiністых глебах робіць іх больш рыхлымі. Попел як вапнавае ўгнаенне зніжае кіслотнасць глебы, да ўсяго ж, не змяшчае хлору і азоту.

Найбольш багаты на вапну (кальцый і калій) попел саломы грэчкі і сланечніку. Максімум фосфару змяшчаецца ў попеле жытняй і пшанічнай саломы. У попеле дроў вапны больш, чым у попеле любой саломы. Попел дроў з вярбы змяшчае кальцыю да 43 працэнтаў, з бярозы — каля 37 працэнтаў. Па колькасці калію і фосфару выдзяляецца попел бярозавых дроў. Найбольш багатым на ўсе пажыўныя элементы лічыцца попел дуба. Шмат калію, фосфару і кальцыю ў попеле бульбоўніку. Вось чаму мэтазгодна адразу пасля ўборкі бульбы спальваць бульбоўнік тут жа на ўчастку.

Попел папярэджвае развіццё ў глебе хваробатворных мікробаў — каранёвых гніляў, кілы капусты. Калі расліны салаты, перцу, тамату і іншых культур адольваюць слізнякі ці смаўжы, трэба шчодра пасыпаць глебу пад імі попелам — шкоднікі не могуць перамяшчацца па ім.

Добрую службу попел служыць газонам. Газонныя травы на прапнаванай глебе лепш растуць, не дапускаючы пустазелля.

Выкарыстоўваюць попел і для намочвання насення перад сяўбой. На 1 л вады бяруць 2 сталовыя лыжкі попелу, настойваюць двое сутак, працэджваюць. Такім настоем можна падкормліваць расаду агародных культур. Захоўваць попел трэба ў сухім месцы — пры ўвільгатненні з яго губляецца калій.

## Карысна ведаць

- Перасаджанае дрэва, як бы вы ні стараліся, захавае толькі частку каранёвай сістэмы. Калі перасадзіць яго ўвосень, абрэзку можна рабіць вясной, да пачатку руху сокаў, калі ж вясной — трэба адразу выразаць дзве трэці галін і замазаць зрэзы садовым варам.
- Перш чым выкапаць лясное або пладовае дрэва, зрабіце на адным з яго бакоў, напрыклад паўднёвым, метку. Асцярожна выцягніце дрэўца разам з каранямі і высадзіце яго на новае месца, захоўваючы той жа накірунак — паўднёвы бок арыентаваны на поўдзень. Калі вы забыліся пра метку, то можна вызначыць як яны былі арыентаваны першапачаткова. Напрыклад, з паўднёвага боку ствол больш цёмны, з паўночнага — зялёны.
- Самыя простыя і даволі даўгавечныя біркі з інфармацыяй аб садовай культуры можна зрабіць з фольгі ад цукерак. Фольгу складваюць у тры-чатыры разы, разгладжваюць, а потым шарыкавай ручкай ці застругананай палачкай выціскаюць неабходную інфармацыю. Застаецца пракалоць бірку і падвесіць на лёсцы да саджанца.
- Калі ў садзе або блізка ад яго расце чорная бузіна, то на дрэвах і кустах не будзе ні кляшчоў, ні тлі, ні пладажэркі.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
| --- | --- | --- | --- |
| Мінск — | 7.47 | 16.03 | 8.16 |
| Віцебск — | 7.42 | 15.47 | 8.05 |
| Магілёў — | 7.37 | 15.53 | 8.16 |
| Гомель — | 7.27 | 15.57 | 8.30 |
| Гродна — | 8.01 | 16.19 | 8.18 |
| Брэст — | 7.55 | 16.27 | 8.32 |

**Месяц**

***Апошняя квадра.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Валерыя, Кірылы, Міхаіла, Фёдара, Фядота, Яўгена.*
***К.*** *Анастасіі, Эдзіты, Анатоля, Фелікса.*




## 20 лістапада

Дзве даты

**Сёння адзначаюцца: Усеагульны дзень дзяцей і Сусветны дзень філасофіі.**

**1899 год** — нарадзіўся Міхась Клімковіч, беларускі пісьменнік і крытык. У 1934—1939 гадах з'яўляўся старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, працаваў галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Выступаў у друку ў розных літаратурных жанрах, распрацаваў жанр драматычнай паэмы. Аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна БССР (1944), лібрэта опер «Апошні вечар на хутары», «Кастусь Каліноўскі», балета «Князь-возера».



У гэты ж дзень нарадзіліся выдатная беларуская паэтэса Яўгенія Янішчыц (1948 год) і паэт Павел Сушко (1909 год).

**1945 год** — пачаўся Нюрнбергскі працэс над лідарамі нямецкага фашызму.

Цытата дня:

*«Ты можаш і не заўважыць, што ў цябе ўсё ідзе добра. Але падатковая служба заўважыць».*

**П'ер Данінас, французскі пісьменнік.**

Свет і сусвет чалавека

# БЛІЗНЯТЫ

**У народных уяўленнях нараджэнне адразу дваіх дзяцей лічылася адмоўным знакам. Казалі, што «блізняты не нараджаюцца да шчасця». У той жа час на Палессі ў некаторых раёнах верылі, што нараджэнне блізнят (таксама як і нараджэнне блізнят-жывёл) прыносіць поспех і прыбытак у гаспадарку. Можа, адмоўнае стаўленне да нараджэння блізнят нашы продкі суадносілі з адмоўнай семантыкай слова «два». Блізнят параўноўвалі з такімі «падвоенымі» катэгорыямі як дзень—ноч, дабро—зло, неба—зямля, святло—цемра: адзін з паказчыкаў абавязкова павінен быў саступіць, а другі — перамагчы.**

- У даўнія часы лічылася, што для сям'і і для ўсёй вёскі нядобра, калі нараджаюцца блізняты. Каб пазбегнуць бяды, дапускалі нават смерць аднаго з іх, каб той тым самым «знёс» у магілу ўсе няшчасці, якія маглі быць справакаваны нараджэннем блізнятаў.
- Каб пазбегнуць такой бяды, асаблівай забаронай для жанчын у час цяжарнасці было ўжыванне падвоеных сліў, яек і г.д., так званых «спарышоў», каб тым самым не справакаваць нараджэнне двойні.
- Каб у сям'і не нарадзіліся блізняты, неабходна было і ў паўсядзённым жыцці выконваць пэўныя правілы. Напрыклад, калі жанчына ставіла булкі хлеба ў печ, трэба было пакласці іх так, каб яны ў час выпечкі не дакраналіся адна да другой і не «аб'ядналіся» паміж сабой, каб не «ўтварыць» той самы спарыш.
- Нашы продкі верылі ў тое, што ў блізнятаў адзін лёс на абодвух, адна душа і адзін анёл-ахоўнік, а гэта значыць, што ім цяжка будзе крочыць па жыцці.
- Лічылася, што смерць аднаго з блізнятаў абавязкова пацягне за сабой смерць другога. Часта пасля смерці аднаго з блізнятаў выконвалі абрад так званага «раздваення»: на парозе хаты сякерай «раздвойвалі» манету, адну палову якой кідалі ў магілу памерламу, а другую пакідалі ў сям'і — хавалі за абразом у чырвоным куце.
- Перакананасць у агульным лёсе і ў адной душы блізнятаў знайшла адбітак у забароне хрысціць і вянчаць такіх дзяцей у адзін дзень. Па некаторых звестках, хрысціць першым трэба было таго, хто нарадзіўся другім, каб тым самым «выправіць» яго долю. Па іншых звестках, першым хрысцілі таго, хто нарадзіўся першым, каб «не пярэчыць» Вышэйшым сілам, якія і абумовілі нараджэнне двойні.
- Звычайна блізнятам давалі сугучныя (падобныя) імёны.
- У некаторых выпадках вёска была рада таму, што сярод аднавяскоўцаў ёсць блізняты. Так, для захавання вёскі ад эпідэміі ў паўночна-заходняй частцы Беларусі і на Палессі праводзілі абрад «абворвання вёскі», які выконвалі браты-блізняты з дапамогай валоў-блізнятаў.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**



*Віншуем са слаўным юбілеем* ***Людмілу Уладзіміраўну НЕМІРОВІЧ****, якая жыве і працуе ў в. Стараволя.*
*Жадаем моцнага здароўя, удачы і ў будні і ў святы,*
*Хай добрыя весткі прыходзяць у хату.*
***Сяброўкі,*** *Пружанскі раён.*

## Усміхнёмся!

Вытрымкі з памяткі для кіроўцы ў Маскве.

1. Пешаходы збіраюцца на «зебры» толькі для таго, каб вас павітаць сваімі крыкамі і воклічамі.

2. Тратуары былі зробленыя памылкова, іх прамое прызначэнне — стаянка вашага аўтамабіля.

3. Язда за трамваем — вельмі зручны і цікавы занятак. Бывае, што ён, зараза, едзе па асобнай паласе, а ўсе стаяць у заторы. Такое бязладдзе доўга не павінна паўтарацца.

4. Пешахода да трамвая, калі ён захоча сесці, пажадана падпусціць, але не абавязкова. Іх шмат, а вы адзін.

5. Кіроўца ў іншай машыне — вырадак, нахабнік і нягоднік.

☺

**— Дарагі, як табе вячэра?**

**— Выдатны кісель.**

**— Гэта не кісель, гэта халадзец.**

**— Так?! Тады прыгатуй хутчэй кісель, я вельмі заінтрыгаваны.**

☺

Добры дзень! Гэта першы канал, праграма «Кантрольны закуп» і я, яе вядучы. Сёння нам трэба прадэгуставаць 4 кілаграмы чорнай ікры і мы як-небудзь абыдземся без пакупнікоў і экспертаў...

☺

**Маленькая дзяўчынка прыйшла да суседкі:**

**— Тата вельмі захварэў і хоча малінавага варэння.**

**— А ў што табе пакласці? Ты ўзяла шклянку?**

**— Ды нічога не трэба. Я тут з'ем.**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 6411. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12